Пролетарыі усіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ялы прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.
Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў)

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Замена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок пайпарэй пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок пайпарэй наперад тэксту 1 р. — к.
За радок пайпарэй перад тэкстам 1 р. 50 к.
Абвешчаньні на 50 проц. дарожэй.
Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумэнт	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Бесправоўн. і інвалідам-вайцам за дакумэнт	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 161 (2349) Субота, 14-га ліпеня 1928 г.

Пяцігадовы плян разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры БССР--на шырокае абгаварэньне.

„Зьезд даручае Цэнтральнаму Камітэту забясьпечыць распрацоўку пяцігадовага пляну з такім разьлікам, каб ён быў пастаўлен на разгляд бліжэйшага Зьезду Саветаў, і ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ПРЫЦЯГНЕНЬНЕ ДА ДАКЛАДНАГА І ЎСЕБАКОВАГА АБГАВАРЭНЬНЯ ПРАЗКТУ ПЛЯНУ ЎСІХ МЯСЦОВЫХ САВЕЦКІХ, ПРАФЭСЫЯНАЛЬНЫХ, ПАРТЫЙНЫХ І ІНШ. АРГАНІЗАЦЫЙ" (падкрэсьлена мною М. К.).

(*З рэзалюцыі XV Зьезду ЎсеКП(б): «Аб дырэктывах па складаньню пяцігадовага пляну народнае гаспадаркі»*).

Першы этап працы па пяцігадоваму пэрспэкцыйнаму плянаваньню народнай гаспадаркі і культуры БССР скончан. Першыя наметкі і ўстаноўкі вылажаны ў матар'ялах Наркаматаў, акругаў і Дзяржпляну і ўвогуле знаходзяцца ў такім стане, што ўжо магчыма пачаць неабходны «абстрэл» як «зьнізу», так і «зьверху», г. зн. разгарнуць неабходнае абгаварэньне і крытыку намечаных установак і пэрспэктыў.

Аблягчаючым і памагаючым момантам зьяўляецца апрача таго і тое, што і саюзныя наркаматы і асабліва Дзяржплян Саюзу змаглі даць шэраг установак у разьвіцьці як народнае гаспадаркі Саюзу ў цэлым, так і асобных яе райёнаў.

Публікуючы ў апошнія часы ў газэтах і часопісях, а таксама і спэцыяльных выданьнях шэраг артыкулаў у якасьці першых установак, тэзісаў і варыянтаў па разьвіцьці народнай гаспадаркі і культуры Беларусі,—гэтым самым яшчэ шырэй адчынецца магчымасьць для ўсебаковага азнаямленьня з тымі матар'ялямі і наметкамі, якія часткова павінны будуць ужо прадрашаць шляхі і вынікі ўсёй працы па пяцігадоваму пэрспэкцыйнаму плянаваньню. Прычым трэба загадзя са ўсёй адкрытасьцю папярэдзіць як чытачоў гэтых артыкулаў і матар'ялаў, так і тых таварышоў, якія будуць пісаць і рабіць свае заўвагі (пажадана, каб гэтых заўваг было як можна больш і каб яны былі як можна сьмялей у сваіх прапановах), што апублікаваныя матар'ялы і па думцы саміх-жа аўтараў і Дзяржпляну патрабуюць пры далейшай іх апрацоўцы значных паправак і ўдасканаленьня, асабліва калі будзе магчыма надагуліць усе матар'ялы, усе думкі ў адзінае цэлае і зьвесьці ўсе матар'яльныя рэсурсы і якасныя паказальнікі ў агульны ітогавы балянс народнае гаспадаркі, прытым ня толькі БССР, але і Усяго СССР.

Таксама неабходна адзначыць, што было-б памылкай лічыць, што шэраг агульных праграмных вываданў ці напрамкаў новага будаўніцтва, рэканструкцыі народнае гаспадаркі, чакаемы эфект і ў зьвязку з гэтым неабходныя тэмпы разьвіцьця і г. д., зьвяваныя цяпер з лічбавымі лімітамі і прыкідкамі, зьяўляюцца ўжо прынятымі ў канчатковым выглядзе. Гэтыя прыкідкі і лімітыні ў якім разе не павінны зьвязваць пашыранае як індывідуальнае, так і калектыўнае абгаварэньне матар'ялаў і асобных лімітаў незалежна ад крыніцы ўзьнікненьня.

Нашай задачай цяпер—затачай плянуючых арганізацый зьяўляецца як мага шырэй пазнаёміць і даць магчымасьць абгаварыць гэтыя матар'ялы ў рабочых і грамадзкіх арганізацых, у навуковых установах і інш. інстанцыях і атрымаць ад іх заўвагі і папраўкі. Сама назва, першыя ўстаноўкі праробленай працы першага пэрыяду даюць поўную магчымасьць улічыць ня толькі агульныя заўвагі па шэрагу праблем, але і па асобных дэталях пляну і асобных канкрэтных аб'ектах будаўніцтва.

Праца Дзяржпляну па сваім размаху зайшла цяпер так далёка, што калі ня будзе ў поўным сэнсе слова мабілізавана ўся навукова-тэхнічная сіла і рабоча-грамадзкая думка, дык цяжка будзе тады справіцца з тэй грандыёзнай працай над пяцігодкай, якую пры гэтым трэба скончыць параўнаўча ў невялікі тэрмін.

Мы ўжо маем цяпер такія зьявішчы, калі ведамсьцьвенныя залукі часта ня лічыліся ні з якімі аб'ектыўнымі ўмовамі ні Савецкага Саюзу, ні БССР. Заўкі складаліся ў многіх выпадках надта замкнута і нават насьцех. Праўда, часу для такой сур'ёзнай працы было ня вельмі многа, але ўсё-ж-такі элемэнтарнейшая ўвязка была-б надзвычайна неабходна. Нельга было задаволіцца толькі тым, што (прыводжу для прыкладу) Наркамасьветы прыцягнуў да сваёй папярэдняй працы ЦП саюзу асьветы. Паўстае пытаньне, хіба іншыя прафэсыянальныя саюзы не зацікаўлены ў гэтай працы? Хіба такія наркаматы як Наркамзем па сельска-гаспадарчай асьвеце на столькі-ж не зацікаўлен, як і Наркамасьветы, ці ВСНГ па лініі адукацыі прамысловай рабочай армії?—Бязумоўна, яны зацікаўлены, але тэхніка працы была пастаўлена так, што гэта магчымасьць прыцягненьня ня была ўлічана.

Тое-ж самае можна сказаць і па часьці працы ВСНГ і Наркамзему: адзін стварае сыравінную базу (сельска-гаспадарчую) для прамысловых прадпрыёмстваў (асабліва ў БССР), а другі, г. зн. ВСНГ—карыстаецца ёю. І калі прасачыць пытаньне, на колькі праводзілася тая неабходная элемэнтарная сувязь для вучоту магчымасьці і неабходнасьці, дык вынік атрымоўваецца той-жа самы, як і з Наркамасьветы.

Вось чаму цяпер вельмі неабходна гэты сур'ёзны арганізацыйны прабел першага пэрыяду працы, які дапушчан наркаматамі, улічыць і выправіць. Затое і наш заклік сёньня зьяўляецца заклікам ня толькі да кожнага актыўнага калектыву, ці асобнага працаўніка даць свае практычныя заўвагі і прапановы на аснове агульных дырэктыў і ня толькі на блізкай яму працы, але і па тых частках яе, якія ажыцьцяўляюцца іншымі.

Напрыклад: НКЗем па ВСНГ і наадварот, далей НКЗем і ВСНГ па НКАсьветы, НКПрацы па ВСНГ і НКАсьветы і г. д. Адным словам, перакрыжованым агнём павінна быць абстрэлена цяпер праца Дзяржпляну і асобных варыянтаў наркаматаў; крытыка павінна ўскрыць усе недахопы і пралікі, а гэтакія маюць месца—гэта бясспрэчна.

Асабліва трэба ўлічыць тыя цяжкасьці, у якіх усё яшчэ знаходзіцца наша народная гаспадарка і культура: калі нашы статыстычныя матар'ялы надта непадрыхтаваны і наогул ёсьць у нашым распараджэньні ў недвадзьвяючай колькасьці; калі цэлыя галіны народнае гаспадаркі і прыродныя багацьці краіны пакуль што яшчэ ня вывучаны і знаходзяцца ў нечапаным стане; калі мы ня маем дакладных даных аб стане нашых школ ня толькі ў якасных, але і колькасных адносінах; калі наша «эканамічнае райёнаваньне» БССР пакуль што знаходзіцца ў дысвусійным стане і калі шэраг намечаных варыянтаў у саюзным маштабе, ці ў маштабе суседніх Саюзных Рэспублік невядомы; калі такое важнае пытаньне, як сыстэма народнае асьветы, у нас па ўсім Саюзе і БССР ня вырашана. Бязумоўна, што ўсё гэта ня толькі ўскладняе працу, але і наперад гаворыць, што праца ня можа быць поўнай, асабліва ў сваёй першай пастаноўцы і першых намётках пяцігадовага пляну. Але затое гэта яшчэ больш абавязвае нас узмацніць увагу ўсіх устаноў і арганізацый, асабліва рабочых і навуковых. Мабілізаваць усю цярплівасьць дзеля таго, каб падрабязна абмеркаваць усе дэталі тых варыянтаў і тэзісаў, якія апублікаваны, ці знаходзяцца яшчэ ў сталы разгляду.

Мы [illegible] часопісі, як «Плуг» (НКЗем), «Мэдычная думка» (НКАховы Здароўя), «Кааперацыйны шлях» (Белкаапсаюз), «Прафэсыянальны рух», а таксама і ўсе нашы газэты—разгарнуць на сваіх старонках шырокае абгаварэньне пяцігадовых праблем нашага народна-гаспадарчага разьвіцьця.

Прэса была і засталася галоўнейшым пісьмовым сродкам у галіне падрыхтоўкі шырокіх мас рабочых і сялян да справы сацыялістычнага плянаваньня народнай гаспадаркі.

Мы пакуль што мала маем магчымасьці пачуць голас рабкораў з заводаў і прадпрыёмстваў, дзе трэсты і прадпрыёмствы павінны былі абмеркаваць свае канкрэтныя пяцігодкі свайго заводу, свайго трэсту.

Калі гэта абгаварэньне не рабілася, дык яго ня позна яшчэ прарабіць, паколькі першы пэрыяд—пэрыяд першых установак—дае магчымасьць сьмела мяняць у выпадку неабходнасьці шэраг разьлікаў і меркаваньняў нават у самых канкрэтных разрэзах.

Нам ужо раз прышлося пісаць аб тым, што тыя заўвагі вытворчых нарад, якія можа быць і незаўсёды ўлічваюцца трэстамі, усё-такі гэтыя заўвагі, нават і ня прынятыя, павінны быць даведзены ня толькі да трэсту, але значна вышэй і шырэй, а гэта магчыма толькі праз нашы штодзённыя газэты і масавыя часопісі.

Да зацьверджаньня канчатковага пяцігадовага пляну засталося часу ня больш 2 месяцаў — тэрмін невялікі для такое сур'ёзнае працы.

Неабходна са ўсёй актыўнасьцю і адказнасьцю скарыстаць рашту часу, і гэта будзе поўным і адзіным залогам дабіцца паўнаты нашай плянавай працы і ў прыватнасьці ўсебаковай праверкі пэрспэкцыйных мерапрыёмстваў па пяцігадоваму пэрспэкцыйнаму пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі і культуры.

М. КАРКЛІН.

ВАЕННАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ ПОЛЬШЧЫ ПРОЦІ ЛІТВЫ.

ВАРШАВА, 12-7. Усходняе агенцтва паведамляе, што гэтымі днямі на тэрыторыі Віленскага ваяводзтва пачнуцца манэўры, у якіх будуць удзельнічаць 4 пяхотных дывізіі, а таксама кавалерыйскія часьці і артылерыя. Палітычныя колы *ацэньваюць назначэньне манэўраў у такі нязвычайны час ды яшчэ на тэрыторыі Віленскага ваяводзтва, як ваенную дэманстрацыю проці Літвы ў зьвязку з разрывам апошніх перамоў.*

Аб разьвіцьці сельскай гаспадаркі.

Рэзалюцыя пленуму ЦК УсеКП(б).

Галоўным фактарам сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР зьяўляецца шпаркі рост сацыялістычнай прамысловасьці на базе новай тэхнікі (рэканструкцыя), рост будаўніцтва наогул, у тым ліку электрабудаўніцтва, рост гарадоў і прамысловых цэнтраў, колькасны і якасны рост рабочай клясы. Але сацыялістычнае будаўніцтва ня можа вычарпацца адною толькі прамысловасьцю. Каб быць поўным і ўсебаковым, яно павінна ахапіць сельскую гаспадарку, злучаючы яе з прамысловасьцю, увялічаючы ўзровень яе разьвіцьця. Між тым, сельская гаспадарка ўсё яшчэ знаходзіцца на вельмі нізкім узроўні, а тэмп яе разьвіцьця вельмі адстае ад тэмпу разьвіцьця прамысловасьці. Калі прамысловасьць сама па сабе зьяўляецца магутным рухавіком сельскай гаспадаркі на шляху яе перабудовы на аснове сацыялістычнай індустрыялізацыі, дык сельская гаспадарка зьяўляецца базаю разьвіцьця прамысловасьці, і як рынак, які спажывае вырабы прамысловасьці, і як пастаўшчык сыравіны і харчу. Больш таго, ад разьмераў вывазу сельска-гаспадарчых прадуктаў і, перш-на-перш, збожжа залежаць у значнай ступені разьмеры прывозу сродкаў вытворчасьці для прамысловасьці, ствараючы нейкую мяжу для тэмпу яе разьвіцьця. Нарэшце, ад разьмераў вывазу сельска-гаспадарчых прадуктаў залежыць у вялікай меры магчымасьць накапленьня валютных рэзэрваў, неабходных для гаспадарчага манэўраваньня. З гэтае прычыны вельмі нізкі ўзровень сельскай гаспадаркі, асабліва не галіны збожжа, пры няўхільнасьці шпаркага тэмпу разьвіцьця сацыялістычнай прамысловасьці, які дыктуецца ўсімі вонкавымі і ўнутранымі варункамі, стварае небясьпеку разрыву між сацыялістычным горадам і дробна-сялянскай вёскай—значыць — небясьпеку парушэньня галоўнай умовы сацыялістычнай перабудовы ўсёй народнай гаспадаркі. Гэтая небясьпека становіцца асабліва значнаю ў зьвязку з адсталасьцю вытворчасьці збожжа, рост якой адстае ад росту патрэбнасьці на хлебныя прадукты, як для здаволеньня патрэб унутранага рынку, так і для разьвіцьця вывазу. З усіх галін сельскай гаспадаркі гаспадарка збожжа зьяўляецца найбольш адсталаю як у сэнсе яе ўраджайнасьці, так і ў сэнсе таварнасьці. Найбольш характэрным у гэтых адносінах трэба лічыць тое, што, не зважаючы на дасягнутыя 95 проц. даваеннай нормы засеўнай плошчы, таварны выхад збожжа ледзь перавышае 50 проц. даваеннай нормы. Адгэтуль амаль што поўнае зьмяншэньне вывазу хлеба, які дасягаў перад вайною 600-700 мілёнаў пудоў штогоду. У аснове гэтай адсталасьці збожжавай гаспадаркі і вострага скарачэньня яе таварнасьці (у параўнаньні з даваенным часам) ляжыць распыленасьць, дробнасьць і агульны нізкі ўзровень сельска-гаспадарчай вытворчасьці, дробна-сялянскі тып збожжавай вытворчасьці і зьвязаны з гэтым поўнатуральны характар гэтай вытворчасьці. Ня малае значэньне маюць тут такія акалічнасьці, як дрэннае выкарыстаньне ўсіх тых шляхоў і магчымасьцей, пры дапамозе якіх можа быць павялічана прадукцыйнасьць дробнай і сярэдняй сялянскай гаспадаркі, асабліва ў частцы павялічэньня ўраджайнасьці культур збожжа (чыстагатунковае насеньне, машыны, угнаеньне, землеўпарадкаваньне, агратэхнічная прапаганда)—з аднаго боку, і няспрыяючае становішча збожжавай гаспадаркі ў сэнсе цэн на яе прадукцыю, у параўнаньні з цэнамі на прадукты іншых галін сельскай гаспадаркі—з другога. З гэтае прычыны праблема збожжа зьяўляецца адною з самых сур'ёзных праблем гаспадарчай палітыкі. Каб вырашыць праблему збожжа, адхіліць небясьпеку разрыву між горадам і вёскаю, зьнішчыць самую аснову магчымых перашкод на хлебным фронце і забясьпечыць, такім чынам, шпаркі тэмп індустрыялізацыі краю, неабходна:

1) забясьпечыць дапамогу далейшаму ўзьдыму прадукцыйнасьці індывідуальнай дробнай і сярэдняй сялянскай гаспадаркі, якая значны час яшчэ будзе базаю збожжавай гаспадаркі ў краі (машыны, мінэральныя ўгнаеньні, чыстагатунковае насеньне, кантрактацыя засеваў, землеўпарадкаваньне і г. д.), усё больш і больш ахапляючы яе сеткаю кааперацыйных арганізацый і спрыяючы аб'яднаньню вытворчых працэсаў сялянскіх гаспадарак, выходзячы з выразна слабых вынікаў уцягненьня сялянскіх гаспадарак і кааперацыйны зваротаў, асабліва ў напрамку сельска-гаспадарчай вытворчай кааперацыі. Пленум зварачвае ўвагу ўсёй партыі на рашаючае значэньне практычнага ажыцьцяўленьня ленінскага кааперацыйнага пляну ў справе павялічэньня ўраджайнасьці і таварнасьці індывідуальнай сялянскай гаспадаркі, і паступовага ўцягненьня яе ў сацыялістычнае будаўніцтва;

2) няўхільна ажыцьцяўляць пастаўленую XV зьездам задачу «аб'яднаньня і перабудовы дробных індывідуальных сялянскіх гаспадарак у буйныя калектывы», як дабраахвотныя аб'яднаньні, пабудаваныя на базе новай тэхнікі, якія зьяўляюцца павялічэньня яе прадукцыйнасьці і таварнасьці;

3) разьвіць сучасныя савецкія гаспадаркі і пабудаваць новыя збожжавыя, як «буйныя сацыялістычныя эканоміі» (праграма партыі), якія забясьпечваюць максымум таварнасьці і зьяўляюцца поруч з калектыўнымі гаспадаркамі апорнымі пунктамі дапамогі рэканструкцыі сялянскай гаспадаркі.

Калі распыленасьць, дробнасьць і адсталасьць збожжавай гаспадаркі зьяўляецца базаю магчымых перашкод на хлебным фронце, дык магчымасьць гэта была абернута ў рэальнасьць іменна сёлета, у выніку чаго і разгуляўся загатоўчы крызіс, дзякуючы раду спэцыфічных прычын. Да ліку гэтых спэцыфічных прычын трэба аднесьці: а) парушэньне рынчнай раўнавагі і абвостраньне гэтага парушэньня дзякуючы больш шпаркаму росту платаздольнага попыту з боку сялян у параўнаньні з прапановаю прамысловых тавараў, выкліканае павялічэньнем прыбытковасьці вёскі, асабліва яе заможных і кулацкіх гушчаў; б) няспрыяючыя суадносіны цэн на хлеб у параўнаньні з цэнамі на іншыя прадукты сельскай гаспадаркі, што паслабляла стымул да рэалізацыі хлебных лішкаў, і чаго, аднак, не магла зьмяніць партыя ў другой палове загатоўчага году, ня ўзьнімаючы канфлікту з маломоцнымі гушчамі вёскі; в) памылкі пляновага кіраўніцтва, пераважна ў галіне своечасовага завозу тавараў і падатковага абкладаньня (малы падатак для заможных гушчаў вёскі); г) недахопы загатоўчых і партыйна-савецкіх арганізацый (адсутнасьць адзінага фронту, адсутнасьць актыўнасьці, стаўка на самацёк); д) выкарыстаньне ўсіх гэтых мінусаў капіталістычнымі элемэнтамі гораду і вёскі (кулакі, спэкулянты) для падрыву хлебазагатовак. У выніку гэтых мінусаў дзяржава апынілася да студзеня 1928 г. перад дэфіцытам у 128 мілёнаў пудоў хлеба ў параўнаньні з леташнім, што стварала пагрозу крызісу для ўсёй народнай гаспадаркі. Дзякуючы своечасна ўжытым захадам, якія ў вядомай сваёй частцы насілі надзвычайны характар, партыі і савецкай уладзе ўдалося адхіліць гэтую пагрозу, здагнаць за студзень—сакавік страчанае ў першай палове загатоўчага году і давесьці да 1 красавіка загатоўкі хлеба да леташніх разьмераў, што пры далейшым выкананьні пляну хлебазагатовак забясьпечыла-б патрэбы ўнутранага рынку да новага ўраджаю.

Аднак, у выніку пагібелі азіміны на поўдні Украіны і часткаю на Паўночным Каўказе, якія зьяўляюцца галоўнымі пастаўшчыкамі хлеба, Украіна поўнасьцю, а Паўначны Каўказ часткова выпалі, як раёны дастаўкі; гэта ня толькі зьменшыла загатоўчыя магчымасьці дзяржавы да новага ўраджаю мілёнаў на 25, але патрэбавала яшчэ насеннай дапамогі для перасеву, паставіўшы дзяржаву перад неабходнасьцю давесьці яравую насенную дапамогу па ўсім СССР да 30-ці мілёнаў пудоў. Гэтыя прычыны ды яшчэ перарасход у дастаўцы хлеба звыш пляну для здаволеньня пашыранага кола спажыўцоў прымусілі загатоўчыя арганізацыі павялічыць загатоўку ў іншых хлебных райёнах і закрануць страхавыя запасы сялянства.

Усё гэта стварыла грунт для паўторнага ўжыцьця надзвычайных захадаў і для адміністрацыйнага свавольства ў загатоўчых райёнах, для парушэньня рэвалюцыйнай законнасьці, для частковага ўжыцьця мэтадаў прадразьвёрсткі (абход двароў, зачыненьне рынкаў, незаконныя вобыскі і г. д.), а ў райёнах спажываючых, у зьвязку з вострым скарачэньнем пляну дастаўкі, прывяло шмат дзе да „хвастоў" і частковага ўвядзеньня картачак на хлеб. Гэта выклікала незадаволеньне сярод некаторых гушчаў сялянства і вывялася ў выступленьнях пратэсту проці адміністрацыйнага свавольства ў некаторых райёнах, палегчыўшы капіталістычным элемэнтам у вёсцы выкарыстаць гэтае незадаволеньне проці савецкай улады, ажывіўшы дзейнасьць контрэвалюцыйных элемэнтаў і даўшы падставу для гутарак наконт скасаваньня НЭП,у. Цэнтральны Камітэт партыі пры ўвядзеньні надзвычайных захадаў в усёй рашучасьцю падкрэсьліў іх часовы характар, і, калі, не зважаючы на гэта, узьніклі тлумачэньні гэтых захадаў, як арганічна выплываючых з пастаноў XV зьезду партыі аб павялічэньні наступу на капіталістычныя элемэнты вёскі, дык такія тлумачэньні сьведчаць толькі, што на некаторыя пласты партыі да гэтага часу робіць уплыў чужая ёй ідэалёгія. Партыя ў сваёй палітыцы павінна выходзіць з рашучай барацьбы з усімі элемэнтамі, якія зьяўляюцца выяўленьнем буржуазных тэндэнцый у нашым краі і спрабуюць абыйсьці пастанову XV зьезду «разьвіваць далейшы наступ на кулацтва», так і з тымі элемэнтамі, якія імкнуцца надаць надзвычайным і часовым захадам характар пасталінага, ці доўгага курсу і тым паставіць пад пагрозу справу саюзу рабочых і асноўных мас сялянства. Рашуча адмятаючы контр-рэвалюцыйную брахню аб скасаваньні НЭП'у, цалкам адхіляючы адступленьне ад пастаноў XV зьезду і праводзячы далей (зусім ня мэтадамі так званага „раскулачваньня") наступ на кулака,—пленум ЦК залуляе, што НЭП зьяўляецца такою палітыкаю пралетарскай дзяржавы, якая «эканамічна і палітычна поўнасьцю забясьпечвае нам магчымасьць пабудовы падмурку сацыялістычнай эканомікі» (Ленін). Пленум ЦК залуляе, што разьвіцьцё сацыялістычных форм гаспадаркі на аснове НЭП'у прыводзіць не да паслабленьня, а да павялічэньня адпору з боку капіталістычных элемэнтаў, пры адначасным, яшчэ большым узмацненьні савецкай улады і яе масавай базы, што ня выключае вядомых ваганьняў некаторых гушчаў жыхарства ў выпадку абвостраньня ўсіх варункаў. Галоўнай клясавай установкай партыі на вёсцы павінна быць «палітыка апоры на беднату, моцнага саюзу з серадняком і наступу на кулака» (XV зьезд). Калі разьвіцьцё сацыялістычных форм вядзе да павялічэньня адпору з боку капіталістычных элемэнтаў, дык памылкі пляновага кіраўніцтва і мінусы нашай палітыкі павялічваюць ступень гэтага адпору, даючы магчымасьць гэтым элемэнтам павесьці за сабою некаторыя гушчы дробнай буржуазеі ў горадзе і ў вёсцы. З гэтае прычыны ўвага партыі павінна быць накіравана ў надыходзячай хлебазагатоўчай кампаніі на тое, каб правесьці мерапрыёмствы, якія ліквідуюць гэтыя мінусы і памылкі і выключаюць неабходнасьць ужываць розныя надзвычайныя захады. Да гэтых мерапрыёмстваў адносяцца. 1. Неадкладная ліквідацыя абходу двароў, незаконных вобыскаў і розных парушэньняў рэвалюцыйнай законнасьці. 2. Неадкладная ліквідацыя ўсіх і зьнішчэньне ўсіх спроб зачыняць рынкі з забясьпячэньнем максымальна добрых форм парадкаваньня гандлем з боку дзяржаўных органаў. 3. Вядомае павялічэньне цэн на хлеб з некатораю розьніцаю па райёнах і культурах збожжа. 4. Недапушчаць паўторнасьці памылак у справе разьмеркаваньня прамысловых тавараў і забясьпечыць своечасны завоз прамтавараў у хлебазагатоўчыя райёны. 5. Народзіць палітыку звароту крэдытаў і збору адзінага сельска-гаспадарчага падатку в інтарэсамі хлебазагатовак, забясьпечыўшы своечасны іх уплыў. 6. Праводзіць неаслабную барацьбу з самагонаваркаю. 7. Правільная арганізацыя справы дастаўкі хлеба, якая не дапушчае перавыдаткаў звыш устаноўленых пляноў і ўскладае адказнасьць за дастаўку спажыўцом, на ўваходзячым у агульны дзяржаўны плян, на мясцовы таваразварот і мясцовых загатоўцаў. 8. Абавязковае стварэньне дзяржаўнага хлебнага (харчовага і насеннага) рэзэрву. Сур'ёзная насенная дапамога савецкай улады беднаце і сярэдняму селяніну забясьпечыла значнае пашырэньне яравой засеўнай плошчы. Гэта супала з добрай надзеяй на ўраджай, які ацэньваецца ЦСУ СССР, водлуг даных на 15-га ліпеня, вышэй сярэдняга. Усё гэта, плюс рост прамысловай прадукцыі і рэарганізацыі загатоўчага апарату, злучаныя з памянёнымі мерапрыёмствамі, павінна палегчыць, не зважаючы на недахват манэўраных запасаў хлеба, дасягненьню нармальнага тэмпу загатовак яшчэ да восені. Ажыцьцяўленьне пастаноў XV партзьезду ў справе далейшага наступу на капіталістычныя элемэнты вёскі абавязвае ўсю партыю і ўсіх камуністаў праводзіць неадступную і сыстэматычную працу ў галіне павялічэньня палітычнай актыўнасьці беднаты і ўзьдыму яе гаспадаркі. Пленум упэўнен, што партыя выйдзе з гонарам з сучасных перашкод. Пленум заклікае ўсе арганізацыі партыі і ўсіх камуністаў напрудзіць усе свае сілы для пасьляхоўнага правядзеньня палітыкі партыі ў справе хлебазагатовак.

Ухваляючы мерапрыёмствы Палітбюро, ужытыя ў выкананьне пастановы 15 партыйнага зьезду аб узмацненьні сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі на аснове палепшаньня сельска-гаспадарчай тэхнікі, шырокага ўжываньня ўдасканаленых машын і прыладаў, уцягненьня ў сельска-гаспадарчы зварот вольных зямельных фондаў і павялічэньня выхаду таварнага збожжа,—пленум ЦК ухваляе дадзеную палітбюро канкрэтную дырэктыву аб арганізацыі ў працяту 4-5 год у РСФСР і на Украіне новых буйных савецкіх гаспадарак па засеву хлеба ў райёнах, дзе ня могуць быць закрануты новымі савецкімі гаспадаркамі сялянскія «надзелы», з разьлікам, каб да канца гэтага тэрміну мець у іх гадавы засеў таварнага хлеба ў разьмеры ста мілёнаў пудоў. Пленум ЦК прапануе ў далейшай працы па арганізацыі новых збожжавых савецкіх гаспадарак кіравацца наступнымі палажэньнямі: 1) неабходна з усёй дакладнасьцю зрабіць адбор зямельных вучасткаў для арганізацыі новых збожжавых савецкіх гаспадарак, намеціўшы гэтыя вучасткі ў найбольш адпаведных з пункту погляду кліматычных, глебавых і эканамічных умоў у райёнах, каб забясьпечыць пры мінімальнай рызыцы найбольшую рэнтабельнасьць гэтых прадпрыёмстваў. 2) Новыя савецкія гаспадаркі павінны будавацца на такім пляне і з такім разьлікам, каб у будучым маглі ператварыцца ў індывідуальныя цэнтры перапрацоўкі сельска-гаспадарчых прадуктаў акаляючага сялянскага насельніцтва і зрабіцца магутнымі рычагамі аграмаджаньня сялянскага земляробства (напрыклад, Украінскай савецкай гаспадаркі імя Шэўчэнкі). 3) Прыняць меры да адшуканьня сродкаў, неабходных на пакрыцьцё выдаткаў аб арганізацыі новых збожжавых савецкіх гаспадарак з разьлікам на атрыманьне да канца будаўнічага пэрыяду таварнага хлеба ў разьмеры 100 мілёнаў пудоў. 4) Зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу абласных камітэтаў, губкомаў і прафсаюзных органаў на дакладны падбор кіраўнічых кадраў для будаўніцтва і вядзеньня новых збожжавых савецкіх гаспадарак, каб на гэтую працу вылучаліся лепшыя спэцыялісты в вялікім стажам практыкі, найбольш энэргічныя, вытрыманыя ўладаючыя арганізатарскімі здольнасьцямі, палітычныя кіраўнікі. 5) Ужыць усе захады да таго, каб забясьпечыць новыя збожжавыя савецкія гаспадаркі належнай колькасьцю мёртвага інвэнтару і, у першую чаргу, трактарамі, у мэтах поўнае мэханізацыі сядзібных гаспадарчых прылад і для забясьпячэньня машынізацыі палявых прац у найбольшым разьмеры. 6) Пры будаўніцтве новых савецкіх гаспадарак неабходна шырока ўлічыць і вывучыць вопыт будаўніцтва буйнае сельскае гаспадаркі заграніцаю і ў нашых старых савецкіх гаспадарках, каб забясьпечыць максымальную эканомію сродкаў і скараціць да мінімума нявытворчыя выдаткі. Прызнаць пажаданым частковае прыцягненьне чужаземных будайнікоў у парадку дачы асобных будаўніцтваў ў канцэсіі на аснове падраду. 7) Зацьвердзіць сяданьне на 1928 г. з агульнаю плошчаю ральлі, дастатковай для атрыманьня ў 1929 г. 5-7 мілёнаў пудоў таварнага збожжа

ЛЕДАКОЛ „КРАСІН" ВЫРАТАВАЎ ГРУПУ ВІЛЬЕРЫ.

ГРУПА ВІЛЬЕРЫ ЎЗЯТА НА БОРТ „КРАСІНА".

МАСКВА, 13-7. У камітэце выратаваньня «Італіі» атрымана тэлеграма ад прафэсара Самайловіча, што 12-га ліпеня а 22-й гадз. «Красін» падабраў групу Вільеры і самалёт Люндборга.

РЫМ, 13-7. Агенцтва Стэфані афіцыйна паведамляе; «Чыта ды-Мілана» радыё-тэлеграфуе, што 12-га ліпеня а 21-й гадз. „Красін" узяў на борт групу Вільеры».

„Красін" выратаваў групу Мальгрэма.

МАСКВА. 12-га ліпеня а 24-й гадз. супрацоўніку ТАСС паведамілі ў камітэце дапамогі «Італіі» наступнае: «Толькі што камітэт атрымаў радыёграму ад прафэсара Самайловіча, высланую ўдзень 12-га ліпеня. Хворыя італьянцы Марыяні і Цапі зьмешчаны ў шпітальную каюту і знаходзяцца пад наглядам доктара. «Красін» з посьпехам пасоўваецца наперад і а 15-й гадз. 12-га ліпеня знаходзіўся за 5-7 кілёмэтраў ад групы Вільеры—на 28 град 5 мін. усходняй даўжыні. Ідучы да месца катастрофы, з «Красіна» бачылі людзей, якія падавалі сыгналы.

Прафэсар Самайловіч адказаў ім сыгналамі, што возьме іх варочаючыся назад. Ён лічыць, што гэтыя людзі—альпійскія паляўнічыя, якія вышлі да групы Вільеры. «Красін» кожных паўгадзіны абменьваецца радыёграмамі з «Чыта ды-Мілана». У камітэце лічаць, што выратаваньне групы Мальгрэма было магчымым толькі дзякуючы адважнаму палёту лётніка Чухноўскага. Пры змушанай пасадцы за 35 кілёмэтраў ад «Красіна» самалёт папсаваў шасі і зламаў два вінты. Экіпаж самалёту здароў, усе маторы самалёту спраўны.

«Красін» палічыў сваім абавязкам у першую чаргу пайсьці на дапамогу групе Вільеры, а ўжо затым падабраць Чухноўскага.

Як „Красін" ратаваў групу Мальгрэма.

У 12 гадзін 30 хв. Камітэт дапамогі «Італіі» атрымаў ад праф. Самайловіча данясеньне аб падрабязнасьцях выратаваньня Вільеры.

«Яшчэ за тры мілі да лягеру Вільеры,—паведамляе праф. Самайловіч,—мы заўважылі абернуты самалёт—палатку. Італьянцы давалі дымавыя сыгналы, пачуўшы гучную сірэну „Красіна. Мы падышлі шчыльна да лёдавага поля. Я з таварышамі спусьціўся па трапу на ільдзіну, дзе нас чакалі італьянцы. Нас шчыра абдымалі, вельмі былі задаволены. Група спадзявалася толькі на «Красіна», але не чакала такога блізкага прыходу. Зараз Вільеры, Траяні, праф. Пэгонэк, Чычыёні і Біякі на караблі. Усе здаровы. У Чычыёні зламана нага, але яна папраўляецца. Усе вельмі шчасьлівы, што зноў набылі магчымасьць жыць. Горача дзякуюць камітэт.

Зараз грузім самалёт Люндборга. Ледзь падышлі да ільдзіны, насунуўся туман. Мы чакаем, пакуль ён пройдзе, каб падысьці да выспы Фойі, дзе магчыма знаходзяцца людзі. Потым пастараемся падыйсьці да Чухноўскага, каб забраць яго з таварышамі. Пасьля гэтага мы накіруемся ў Варнінзбэй.

Толькі што я атрымаў тэлеграму ад Нобіле, які горача дзякуе нас і просіць шукаць трэцюю групу на невялікай адлегласьці. Паспрабую гэта зрабіць. Калі сур'ёзна ўзяцца — трэба ісьці ў Варнінзбэй грузіць вугаль.

Каманда і камандны склад «Красіна» горача вітаюць камітэт-ініцыятара дапамогі італьянскае экспэдыцыі».

Вітань выратаваным.

МАСКВА. Старшыня камітэту дапамогі «Італіі» І. С. Уншліхт паслаў такую радыёграму прафэсару Самайловічу і выратаваным італьянцам: «Моцна

Т.т. Кнорын, Чарвякоў і Галадзед — ганаровыя чырвонаармейцы.

У дзень сьвята вызваленьня Беларусі ад белапалякаў асобны полк ДПУ абраў тав. **КНОРЫНА** *ганаровым стралком-гранатамётчыкам.*

18 пагранатрад абраў ганаровым чырвонаармейцам тав. **ЧАРВЯКОВА.**

Койданаўскі пагранатрад абраў ганаровым пагранічнікам тав. **ГАЛАДЗЕДА.**

Палітыка хлебазагатовак.

(*З перадавіцы „Правды“*).

Камінтэрнаўскія пытаньні ў зьвязку з надыходзячым у хуткім часе 6 Усясьветным Кангрэсам, былі дакладна абмеркаваны на пленуме. Для нашае партыі, для УсесКП(б), таксама як і для братэрскіх зарубежных партый,—патрэбна было перад Усясьветным Кангрэсам падрыхтавацца да вырашэньня 2-х асноўных задач, падагуліць два капітальныя вынікі. Трэба было абдумаць насычана вялікімі падзеямі шлях ад 5 да 6-га кангрэсу (1924-1928 г.), абдумаць адпаведны баявы вопыт як паасобных партый, так і ўсяго міжнароднага рэвалюцыйнага руху за гэты час. Трэба было, падругое, абагуліць і перакласьці на мову праграмы ўвесь аграмадны вопыт Камінтэрну. З нашых унутраных СССР-скіх пытаньняў пленум прысьвяціў найбольшую ўвагу палітыцы хлебазагатовак. Пленум вызначыў сувносіны тэмпу разьвіцьця сацыялістычнае прамысловасьці і сельскае гаспадаркі, якія склаліся да сучаснага моманту, адзначыў «вельмі візкі ўзровень сельскае гаспадаркі, асабліва ў яго збожжавай галіне“, зазначыў на неабходнасьць энэргічнага вырашэньня 3-х, шчыльна зьвязаных адна з другой, задач: 1) дапамогі далейшаму ўздыму дробнае і сярэдняе індывідуальнае сялянскае гаспадаркі, якая сыстематычна ахоплівацца кааперацыйным плянам Леніна, 2) няўхільнага правядзеньня ў жыцьцё пастаноў 15-га зьезду аб калектывізацыі; 3) разгортваньня будаўніцтва савецкіх гаспадарак „буйных сацыялістычных эканомій“. Ужо мінулы пленум ЦК у красавіку абвясьціў нашчадную барацьбу розным адміністрацыйным перагібам і пераблытаньням, якія наглядаліся ў практыцы правядзеньня хлебазагатовак.

І пры ўвядзеньні надзвычайных мер Цэнтральны Камітэт партыі в усёю рашучасьцю падкрэсьліў іх часовы характар. Гэты пленум ЦК лічыць, што «ўвага партыі павінна быць накіравана да надыходзячае хлебазагатоўчае кампаніі на тое, каб правесьці мерапрыёмствы» (глядзі рэзалюцыю, у якой гэтыя мерапрыёмствы пералічаны), ліквідуючыя нашы мінусы і памылкі і «выключаючыя неабходнасьць ужываньня якіх-небудзь надзвычайных мер». У сваёй пастанове пленум ухваліў пастанову Палітбюро, накіраваную на ўзмацненьне сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі, шляхам пабудовы збожжавых гаспадарак. Пленум зацьвердзіў канкрэтную дырэктыву Палітбюро аб арганізацыі ў працягу 3 4-х гадоў новых буйных савецкіх гаспадарак з разьлікам на тое, каб да канца гэтага тэрміну атрымаць ад іх гадавую таварную прадукцыю хлеба ў разьмеры ста міліёнаў пудоў. Ва ўхваленай рэзалюцыі аб палепшаньні падрыхтоўкі новых спэцыялістаў, чытач знойдзе шэраг мер, у тым ліку арганізацыйных, накіраваных да таго, каб энэргічна разгортваць і паглыбляць падрыхтоўку ўсяго складу нашае сацыялістычнае гаспадаркі. Рэзалюцыі пленуму ўхвалены адназгодна.

Пастановы гэтыя абавязваюць нашую партыю да няўхільнага, цьвёрдага і рашучага ажыцьцяўленьня іх.

СУПРАЦОЎНІЦТВА НЯМЕЦКАЙ І САВЕЦКАЙ НАВУКІ.

БЭРЛІН, 12-7. Учора таварыства вывучэньня ўсходняй Эўропы наладзіла вечар у чэсьць савецкіх гісторыкаў. На вечары прысутнічалі шматлікія прадстаўнікі міністэрства замежных спраў, выдатныя нямецкія вучоныя і сябры савецкага насольства ў Бэрліне. Усе нямецкія прамоўцы ў выключна цёплых словах віталі супрацоўніцтва нямецкай і савецкай навукі і падкрэсьлівалі яе вялізнае значэньне. З адказам выступілі прафэсары Пакроўскі, Яворскі, Юрэнеў, Пічэта і Ягораў, а таксама паўнамоцны прадстаўнік СССР тав. Красьцінскі. Ад імя агульна-нямецкага і прускага ўраду рачэйны пасол Фрэйтаг перадаў у сваёй прамове спэцыяльныя прывітаньні савецкім гасьцям ад імя канцлера і вітаў ад яго імя пастанову савецкага ўраду агаласіць дакументы, якія павінны паслужыць матар'ялам для дасьледаваньня прычын сусьветнай вайны. Намесьнік Наркома Асьветы РСФСР прафэсар Пакроўскі пад гучныя знакі адабрэньня падкрэсьліў, што агалашаць гэтыя дакументы будуць супольныя сілы Народнага Камісарыяту па Замежных Справах, Камуністычнай Акадэміі і Цэнтраархіву на столькі з мэтаю ахшукаць адказных асоб за мінулую вайну, колькі з мэтаю папярэдзіць новую вайну ў будучым.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ.

НА КАНГРЭСЕ САЦ. ДАПАМОГІ І АХОВЫ МАЦЕРЫ І ДЗІЦЯЦІ Ў ПАРЫЖЫ.

ПАРЫЖ, 10-VII. На кангрэсах сацыяльнай дапамогі і аховы мацеры і дзіцяці, адчыненых у Парыжы ў зьвязку з правядзеньнем „сацыяльнага тыдню“, прысутнічае 2.500 дэлегатаў з 26-ці краёў. СССР прадстаўлен дэлегацыяй у складзе Куляшова, Калсанава і Лебедзевай ад РСФСР, Халоднага і Пуцепкі—ад УССР. Савецкія дэлегаты ўдзельнічаюць у працы сэкцый і выступяць з дакладамі. Віца-старшынёю кангрэсу абран Пуценка, старшыня савецкай дэлегацыі.

Напад нямецкага вэлёсыпэдыста на францускага вартаўніка.

ПАРЫЖ, 11-7. У Майнцы нямецкі вэлёсыпэдыст наскочыў на францускага вартаўніка і цяжка параніўшы яго 2-ма стрэламі з рэвальвэру, уцёк.

ФРАНЦУЗЫ ЦІКАВЯЦЦА ВАЙСКОВЫМІ ЎСТАНОВАМІ РУМЫНІІ.

ВЕНА, 12-7. З Бухарэсту паведамляюць, што туды прыехаў францускі генэрал Лярон.

Ён меў нараду з румынскім вайсковым міністрам і начальнікам генэральнага штабу румынскай арміі, а таксама наведаўся ва ўсе вайсковыя ўстановы ў Бухарэсьце.

Італія і Аўстрыя.

ВЕНА, 11-7. Сёньня Канцлер Зэйпель зрабіў у галоўнай камісіі парляманту даклад аб разьвіцьці адносін між Аўстрыяй і Італіяй з лютага 1928 г. Пасьля спрэчак па дакладу сацыял-дэмакратычны дэпутат Тырołю Абрам прапанаваў прызнаць працу Канцлера нездавальняючай. Прапанова Абрама была адхілена. Камісія большасьцю галасоў ухваліла прапанову прадстаўніка большасьці адобрыць даклад Зэйпеля і прыняць яго да ведама.

КУДЫ ПОЙДЗЕ НЯМЕЧЧЫНА?

Нямецкі друк жвава адгукнуўся на прысуд па справе шахцінскіх шкоднікаў. Закранаючы вынікі суду, нямецкія газэты падраблязна абмяркоўваюць далейшае разьвіцьцё дачыненьняў між Нямеччынаю і СССР. Закранаючы нямецка-савецкія дачыненьні, яны спыняюцца і на дачыненьнях між Нямеччынаю і іншымі буйнымі дзяржавамі капіталістычнае Эўропы.

Пры гэтым, у шэрагах нямецкага друку выразна намячаюцца дзьве групы. Частка газэт выказвае задаволеньне вынікамі суду над шахцінцамі і дамагаецца збліжэньня Нямеччыны з СССР. Другая частка, наадварот, вядзе вострую кампанію паклёпу супроць савецкага суду і патрабуе збліжэньня Нямеччыны з Францыяй і Англіяй для супольнае барацьбы супроць СССР.

Тыя нямецкія газэты, якія вядуць зараз заўзятую супроцьсавецкую кампанію, тлумачаць гэту кампанію арыштам і выдачай суду 3-х нямецкіх грамадзян. Але ж нават многія нямецкія, аўстрыйскія, амэрыканскія буржуазныя газэты, нават прадстаўнікі, працуючых у СССР амэрыканскіх фірмаў пацьвярджаюць, што суд зусім дакладна даказаў наяўнасьць контр-рэвалюцыйнае шкодніцкае арганізацыі ў Данецкім басэйне. Значыць, справа, у якой аказаліся замешанымі нямецкія грамадзяне, зьяўляецца вельмі і вельмі сур'ёзнай. А ці можа нямецкі друк паручыцца за ўсіх нямецкіх інжэнэраў і тэхнікаў?

Бо зусім нядаўна ў самой Нямеччыне разглядалася гучная судовая справа інжынэраў і тэхнікаў, якія вялі шкодніцкую працу ў адносінах да прадпрыёмства, дзе яны служылі і ў карысьць другой канкуруючай фірмы.

Ясна, што зусім ня суд над шахцінцамі зьяўляецца прычынай шалёнае супроцьсавецкае кампаніі з боку часткі нямецкага друку. І, значыць, патрабаваньні другое яе часткі аб збліжэньні з СССР таксама тлумачацца не адным толькі вызваленьнем нямецкіх грамадзян на прысудзе суду.

Тыя нямецкія газэты, якія патрабуюць зараз удзелу Нямеччыны ў англа-францускай барацьбе супроць СССР, заўсёды выступалі супроць нямецка-савецкага збліжэньня, заўсёды штырхалі нямецкі ўрад на супроцьсавецкі шлях і заўсёды, карыстаючыся хоць якой-небудзь прычынкай, гатовы былі ўзьняць суровую супроцьсавецкую кампанію.

Яны вялі супроцьсавецкую кампанію яшчэ ў 1924 годзе ў зьвязку з вядомым паліцэйскім наскокам на наша гандлёвае прадстаўніцтва ў Бэрліне. Яны вялі яе ў зьвязку з англа-савецкім разрывам. Яны вядуць яе і цяпер у зьвязку з шахцінскай справай. Але прычына ўсіх гэтых кампаній заўсёды была тая-ж самая.

Каб вывіць яе, неабходна ўлічыць, што большая частка газэт, удзельнічаючых у чарговай супроцьсавецкай кампаніі, абслугоўвае інтарэсы цяжкае прамысловасьці Заходняе Нямеччыны, якая здабывае, галоўным чынам, вугаль, руду, сталь, будуе вагоны, цягнікі, параходы і г. д. Нічога гэтага мы за граніцай зараз ня купляем, або купляем у самай незначнай колькасьці. Калі савецкая краіна яшчэ толькі аднаўлялася пасьля разрухі, дык заходня-нямецкія прамыслоўцы спадзяваліся, што мы будзем у іх купляць і цягнікі, і вагоны, і рэйкі, і іншыя вырабы.

Разьвіцьцё нашае цяжкае індустрыі, буйныя посьпехі савецкага цягнікабудаўніцтва, потым пабудова суднаў і г. д. пахавала гэтыя надзеі. Адгэтуль узьнікла і набыла шырокую вядомасьць выпушчаная ў зварот заходня-нямецкімі прамыслоўцамі байка, нібы гандаль з СССР нічога не дае Нямеччыне.

Далей, неабходна мець на ўвазе, што за апошнія гады заходня-нямецкая прамысловасьць пачала зьбліжацца з францускімі прамысловымі групамі (франка-нямецкі сталёвы трэст) і ангельскімі банкамі.

Зусім зразумела, што заходня-нямецкія групы цяжкае прамысловасьці не задавальняюцца ўжо проста распаўсюджаньнем паклёпу аб гандлі з СССР. Палітычны кіраўнік гэтых груп, вядомы прамыслоўца Рэйхбэрг, падганяемы ангельскімі агэнтамі, старанна працуе над арганізацыяй англа-франка-нямецкага саюзу, накіраванага супроць СССР.

Вось гэтыя рэйхбэрскія групаваньні і кіруюць сучаснай супроцьсавецкай кампаніяй, узьнятай у зьвязку з шахцінскай справай. Менавіта пад націскам гэтых групаваньняў нямецкі ўрад у сакавіку заявіў, што ў зьвязку з арыштамі ў СССР нямецкіх інжынэраў ён пастанавіў прыпыніць нямецка-савецкія эканамічныя перамовы (а на справе пастанова аб іх прыпыненьні была ўхвалена яшчэ да арышту інжынэраў, проста ў зьвязку з надыходзячай тады зьменай ураду ў Нямеччыне).

Урэшце, пад націскам рэхбэргаўцаў, таксама як і ангельскіх банкаў, нямецкія банкі, пачынаючы з моманту англа-савецкага разрыву, пачынаюць перашкаджаць крэдытаваньню гандлю з СССР. Вось чым тлумачыцца параўнаўча недастатковае разьвіцьцё нямецка-савецкага гандлю.

Гэта ня толькі наша думка. Такое-ж тлумачэньне дае нямецкая буржуазная газэта «Монтаг Морген», належачая да тае газэтнае групы, якая выступае зараз за палітыку збліжэньня з СССР.

Гэта газэтная група, уключаючая такія надзвычайна ўплывовыя ў Нямеччыне буржуазныя газэты, як „Кельнішэ Цэйтунг“ і „Дэйтшэ Альгемэйнэ Цэйтунг“, таксама абумоўлівае інтарэсы цяжкае прамысловасьці, але пераважна тых яе груп, якія вырабляюць машыны і фабрычнае абсталяваньне. А машыны і абсталяваньне зьяўляюцца галоўнымі рэчамі нашага вывазу з Нямеччыны і наогул з-за граніцы.

Уласная вялікая зацікаўленасьць гэтых груп цяжкае прамысловасьці ў гандлі з СССР тлумачыць, чаму яны ў куды большай ступені, чымся рэйхбэргаўцы, павінны лічыцца з аграмадным палітычным значэньнем збліжэньня з СССР для Нямеччыны.

Вопыт апошніх гадоў навочна паказаў, што ўсе спробы Нямеччыны забясьпечыць сабе важнейшыя палітычныя інтарэсы, шляхам збліжэньня з Англіяй і Францыяй, цярпелі няўдачу. І Англія, і Францыя гатовы збліжацца з Нямеччынаю, паскольку гэта адрывае Нямеччыну ад СССР і дазваляе выкарыстаць яе ў барацьбе супроць СССР. Але ў той-жа час ні Англія, ні Францыя ня згодзяцца зрабіць Нямеччыне ніводнае значнае ўступку.

«Нямеччына адна»,—пісала нядаўна наконт гэтага «Дэйтшэ Альгемэйнэ Цэйтунг». Збліжэньне з СССР—адз іны для Нямеччыны выхад з яе сучаснага становішча.

Куды-ж усё-ж-такі пойдзе Нямеччына? Ці ў бок збліжэньня з СССР, ці ў бок ажыцьцяўленьня рэйхбэргаўскіх плянаў барацьбы супроць СССР супольна з Англіяй і Францыяй?

Пры адказе на гэтыя запытаньні неабходна ўлічваць, што на баку рэйхбэргаўцаў стаяць нямецкія сацыял-дэмакраты (меншавікі), якія вядуць зараз асабліва няшчадную кампанію супроць СССР, якія ўжо даўно гатовы выканаць супроцьсавецкую волю Чэмбэрлена і якія бяруць удзел у сучасным урадзе. Але, з другога боку, найбольш моцны ўплыў на сучасны ўрад маюць тыя групы цяжкае прамысловасьці, якія зьяўляюцца прыхільнікамі збліжэньня з СССР.

Таму належыць думаць, што нямецкі ўрад паранейшаму будзе спрабаваць утрымацца між двума асноўнымі шляхамі: у бок СССР і супроць СССР. Ці ўдасца гэта яму,—пакажа блізкая будучыня.

І. С.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

„Заварылі кашу--ды масла няма“.

Буда-Кашалёва, 13-VII. Па справаздачы загадчыка Буда-Кашалёўскай больніцы—справа абстаіць добра. Але вось 4 сядзелкі, даведаўшыся аб лёзунгу самакрытыкі, адзначаюць шэраг недахопаў у больніцы. У больніцы няма працоўнай дысцыпліны, нядбайны дагляд за хворымі.

2—3 месяцы таму назад аднэй хворай жанчыне далі выпіць лякарства для расьціраньня, што выклікала атручаньне. 14-цігадовага хворага туберкулёзам касьці сядзелка Якіменкава пабіла. За кошт кепскага харчаваньня хворых, папраўляліся працаўнікі кухні.

У больніцы наглядалася хабарніцтва. Акушэрка прымала ад парадух падарункі палатном і іншымі рэчамі. У гэтай галіне паміж акушэркай і сястрой адбываліся спаборніцтвы.

Заг. больніцай неадпаўлькава адносіўся да ніжэйшага пэрсаналу. За кожную дробязь пагражае звальненьнем. Затое добра адносіцца да сядзелкі Якіменка, якая доіць яго карову і іншы менка, якая доіць яго карову і іншы раз і абед згатуе. Жонка загадчыка на больнічным кані на пагулянкі езьдзіць.

Мясцком ведае аб усім гэтым, але маўчыць. 6 ліпеня на сходзе калекмаўчыць. 6 ліпеня на сходзе калекмаўцыкі з агульнага сходу, а член мясцкому Курэк перад сходам заявіў сядзелкам: „заварылі кашу, ды масла няма“.

Трэба адзначыць, што інспэктарыят аховы здароўя таксама ў курсе справы больніцы, але ніякіх мер ня прымае.

Махінацыі заможнікаў выкрыты.

СМАЛЯВІЧЫ. Па 80 насельных пунктах выкрыта да 10 ліпеня г. г. аб'ектыў абкладаньня: пахаці 1238 дз., сенажаці 81 дз., буйнай рагатай жывёлы 275 шт., коняй 111 шт., сьвіней 1967 шт., незямляробчых заработкаў 17109 руб.

Наложана штрафу за захаваньне аб'ектаў абкладаньне на 46 асоб у суме 3342 руб. 66 кап.

Самымі буйнымі ўкрываецелямі зьяўляюцца заможнікі хут. Смольні Верхменскага с.-савету Вайцехоўскія Станіслаў і Кароль, якія ўвесь час захоўвалі ад сельскагаспадарчага падатку 17 дз. пахаці, з 35 дз. іх махінацыя сёлета выкрыта і накладзен штраф у суме 600 руб.

Шэршань Рыгор Рыгораў бацька члена с.-савету ўвесь час захоўваў ад сельскагаспадарчага падатку 6,6 дз. пахаці, наложан штраф у суме 500 руб. За імі ідуць заможнікі Губар, Дзярнач, наложан штраф па 150 р. Скуратовіч 100 р. і Тоўсьцін 75 р.

Ёсьць выпадкі ўкрыцьця аб'ектаў членамі с.-саветаў (Смалявіцкі--Рэуцкая, Жодзінскі--Тумілоўіч, Сталыга).

Бедната, як і Уперад, прымае актыўны ўдзел у выкрыцьці аб'ектаў; адотаўшыя с.-саветы сталі падцягвацца: Смалявіцкі выкрыў больш 100 шт. сьвіней.

Вучот закончан па ўсіх насельных пунктах. Цяпер ідзе ўзмацнёная праверка аб'ектаў абкладаньня па ўсяму райёну. К 15 ліпеня чакаюцца вынікі вучоту па ўсяму райёну.

Р. Х.

Сродкі па самаабкладаньні паступаюць слаба.

Гомель, 13-VII. У акрузе грошы па самаабкладаньні ўносяцца слаба. На 1-е ліпеня процант паступленьня быў—47,53. Сельсаветы Веткаўскага, Гомельскага, Буда-Кашалёўскага райёнаў надзвычайна няўважліва адносіліся да спагнаньня грошай па самаабкладаньні. Добра праходзіць спагнаньне ў Хойніцкім і Лоеўскім райёнах. Акрвыканком прапанаваў райвыканкомам узмацніць збор сродкаў па самаабкладаньні з тым, каб у бягучым годзе можна было выканаць намечаныя мерапрыёмствы па дабрабыту селішчаў.

Да Тыдню абароны.

ГОМЕЛЬ, 13-7. У акрузе разгарнулі працу па правядзеньні „Тыдню абароны“. Шмат якія ячэйкі ТДА-Авіяхіму наладжваюць ваенныя паходы, уцягваюць працоўных у члены ТДА-Авіяхіму. У сучасны момант у шэрагах ТДА-Авіяхіму налічваецца 14362 чал. З іх рабочых—6834. Мяркуецца, што „Тыдзень абароны“ дасьць 2500 новых членаў. Асабліва добра разгарнулі працу ячэйкі ТДА-Авіяхіму Хойніцкага, Рэчыцкага і Лоеўскага райёнаў. Адстаюць Буда-Кашалёўскі і Веткаўскі райёны. У Гомелі добра працуюць ячэйкі хлебапякарні ЦРК, фабрыкі абутку «Труд» і друкарні Палесдруку. Слаба працуюць ячэйкі заводаў «Пролетарий», „Двигатель Революции“, фабрыкі „Везувий“.

Новыя школы.

ГОМЕЛЬ, 13-7. У акрузе пачалася пабудава новых школ у сельскіх мясцовасьцях. Да новага навучальнага году будзе пабудавана 9 новых школ. У Церахоўскім райёне пад школу будуецца камяніца. Апроч таго, на рамонт школьных будынкаў будзе выдадзена 20 тысяч руб.

Будаўніцтва пад пагрозай зрыву.

Гомель, 13-VII. Будаўніцтва ў Добрушы знаходзіцца пад пагрозай зрыву, таму што цагельныя заводы ня выконваюць заказу на пастаўку 700 тысяч штук цэглы. Апроч таго жакт імя Фрунзэ ў Рэчыцы дастаўляе фабрыцы надобранкасную цэглу, што павялічвае кошт і пагаршае якасьць будовы.

ВЯЛІКІ ПАЖАР.

БАБРУЙСК, 13-7. Уноч на 12 ліпеня ў вёсцы Польнавічы, Бабруйскага райёну згарэла 15 сялянскіх двароў і адно гумно.

У агні загінула вялікая колькасьць жывёлы.

ЛЕС—БЕДНАЦЕ.

У працягу апошніх 2 месяцаў навальніцы папсавалі сотні тысяч дрэў у лясох Савецкай Беларусі. РВК і сельсаветы павінны прыняць належныя меры, каб буралом з лясоў мясцовага значэньня папаў толькі беднаце, якая адчувае патрэбу ў драўніне.

Страты ад навальніцы.

Сёлета над Беларусьсю пранесьліся 4 вялікія навальніцы: 2 ў маі, 1—у чэрвені (найбольш моцная) і апошняя 4 ліпеня. Гэтымі навальніцамі зьнішчаны ў лясох БССР сотні тысяч дрэў таварнага лесу. Па прыблізных падліках загінула ад навальніц каля 50 проц. гадавой лесасекі.

У Бабруйскай і Магілеўскай акругах ёсьць такія дачы, дзе процант вывернутых дрэў вельмі значны.

Па нянoўных вестках у Бабруйскай акрузе загінула каля 39 тысяч дрэў, Магілеўскай—да 200 тысяч кубамэтраў. У Дрыбенскім лясьніцтве, Аршанскай акругі зьнішчана каля 25 тысяч дрэў, а па ўсёй акрузе—каля 70 тысяч штук.

У Менскай акрузе—каля 250—у Гомельскай—каля 50 тысяч, у Віцебскай—каля 30 тысяч, у Мазырскай—каля 20 тысяч і ў Полацкай—каля 15 тысяч кубамэтраў.

Зараз буралом у тэрміновым парадку распрацоўваецца па дагаворах з Лесбелам і інш. арганізацыямі. Апошні тэрмін распрацовак у лясох дзяржаўнага значэньня будзе працягнут у крайнім выпадку да 1-га жніўня (звычайна распрацоўкі буралому павінны быць закончаны да 15-га ліпеня).

У сувязі з тым, што зараз папсавана шмат лесу, будуць скарачацца разьмеры лесасек (калі разьмеры страт перавышаюць 10 проц. масы па данай гаспадарцы, ці па данай дачы). Гэта залічэньне буралому ў лесасекі ў першы год займае адну пятую частку, а звыш гэтае нормы будзе залічвацца—у працягу бліжэйшых 5 год.

Больш усяго падарпелі ад навальніцы старыя дрэвы, галоўным чынам елка, хвоя, асіна.

Таксама робяцца захады да падчыстку буралому ў лясох мясцовага значэньня. РВК і сельсаветам запрапанавана ў тэрміновым парадку распачаць падчыстку буралому.

Пільная ўвага зварачваецца на барацьбу з распаўсюджваньнем шкодніка караеда. Дзеля гэтага дадзен загад увесь буралом, яловыя і хваёвыя пні абкарыць, а кару спаліць.

Страты ад навальніцы ў лясох Менскай акр.

Страты ў лясох Менскай акругі ад навальніцы перавышаюць гадавую лесасеку. Увесь буралом зараз распрацоўваецца ў тэрміновым парадку. У першую чаргу задавальняецца лесам мясцовае насельніцтва, якому буралом прадаецца па сялянскай таксе, затым мясцовым установам: на патрэбы школ, больніц, лазьняў, хат-чытальняў, мастоў, дарог і інш. І, урэшце, па генэральнаму дагавору, буралом распрацоўваецца Лесбелам.

Прымаюцца захады, каб падчыстку буралому закончыць да касавіцы. Дзеля гэтага заробак рабочых на лясных распрацоўках значна павышан, дасягаючы часта да 6-8 руб. (рабочы з канём).

У сувязі з тэрміновасьцю работы былі намеры запрасіць рабочых на лесараспрацоўкі з іншых райёнаў Савецкага Саюзу. Больш мэтазгодным зьявіцца-б, каб выкарыстаць на падчытках буралому мясцовае насельніцтва, забясьпечыўшы яго толькі хлебам.

На падчыстку буралому ў лясох мясцовага значэньня трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу. РВК і сельсаветы павінны своечасова паклапаціцца, каб буралом пападаў толькі беднаце. Ні для каго не выяўляецца сакратам, што ў многіх мясцох ня зусім правільна эксплёатуюцца лясы мясцовага значэньня, і сяляне, былыя ўласьнікі іх яшчэ да гэтага часу чамусьці гаспадараць у лесе, як у сваёй хаце. Гэтага не павінна быць. Трэба цьвёрда і своечасова прыняць меры, каб буралом папаў таму, каму патрэбен лес, а ня больш заможным і моцным гаспадаркам, бо лес можа зараз вытраляваць толькі моцны гаспадар, а беднота нічога не атрымае.

Ем. Яраслаўскі.

ШТУРМАН НАДЫХОДЗЯЧАЙ БУРЫ*),

(ДА СОТАЙ ГАДАВІНЫ З ДНЮ НАРАДЖЭНЬНЯ М. Г. ЧАРНЫШЭЎСКАГА).

Чарнышэўскі аб вобшчыне.

Чарнышэўскі няраз падкрэсьліваў, што вобшчына—зусім не спэцыяльна расейская форма гаспадаркі. На вядомай ступені разьвіцьця яе можна сустрэць ва ўсіх народаў, а ў Расеі яна захавалася проста дзякуючы адсталасьці і вяласьці разьвіцьця Расеі.

Чарнышэўскі прадбачыць карэнную рэформу, карэнную рэвалюцыю ў земляробстве. Пакуль што «капітал (у 1860 годзе) яшчэ ў вельмі слабой меры ўкладаецца ў земляробства». Але гэта —часовае зьявішча. Капітал імкнецца захапіць усю галіну вытворчасьці, у тым ліку і сельскую гаспадарку. Дзякуючы посьпехам тэхнікі, хэміі, мэханікі, дзякуючы ўдасканаленьню мэтадаў апрацоўкі зямлі, ужываньню буйных і дорага каштуючых машын, робіцца няўхільным «наближэньне карэннае рэформы земляробчае вытворчасьці, рэформы пакшталт тае, якая праведзена ў мануфактурнай справе вынаходкамі канца мінулага і пачатку цяперашняга стагодзьдзя».

У вобшчыне Чарнышэўскі бачыў форму, якая дасьць магчымасьць лягчэй перайсьці да сацыялізму. Калектыўную, грамадзкую форму гаспадаркі ён бараніў усімі довадамі і бараніў умела, таленавіта.

Зразумела, пры захаваньні буржуазнае ўласнасьці і буржуазнае ўлады ня правільна было марыць аб сацыялістычнай арганізацыі працы. Толькі пасьля кастрычніка 1917 году стала магчыма сапраўдная аграрная рэвалюцыя, стала магчымым ажыцьцяўленьне заветных мараў Чарнышэўскага. Уся зямля перайшла да працоўных бяз выкупу, па ўсёй краіне арганізуюцца працоўныя камуны. Вобшчына, якая так і не разьвіла сацыялістычнае формы гаспадаркі, уступае месца савету, сацыялістычнай камуне; упяршыню ў гісторыі на абшары аграмаднае краіны праведзен вопыт сацыялістычнае гаспадаркі пры падтрыманьні самага дэмакратычнага з існуючых да гэтае пары ўраду, пры ўсё больш і больш растучай ролі кааперацыі і машыннае тэхнікі.

Ля крыніц марксызму.

Будучы добра знаёмым з гісторыяй і з грамадзкімі адносінамі людзей, з разборам і крытыкай буржуазных эканамістаў, і дзякуючы свайму тонкаму наглядальнаму розуму, Чарнышэўскі выпрацаваў правільны погляд на барацьбу клясаў і значэньне яе ў сучаснай грамадзе. Некаторыя месцы яго твораў паказваюць, як блізка ён падыйшоў на навуковага сацыялізму, хоць і ня быў знаёмым з творамі Маркса і Энгельса. Калі Камуністычны Маніфест Маркса і Энгельса пачынае з таго, што гісторыя да гэтага часу была нічым іншым, як барацьбой клясаў, дык і Чарнышэўскі прызнае, што «да гэтага часу ў гісторыі ня было ніводнага прыкладу, калі-б посьпех быў без барацьбы, бяруць удзел у барацьбе грамадзкія клясы; рухаюць грамадзкімі клясамі, дзеямі народных мас пэўныя клясавыя інтарэсы».

Ён сьмяецца над тымі, хто мяркуе, што «людзямі кіруюць не інтарэсы, а разумовыя вывады». Сучасныя дзяржавы ўсе ўзьніклі ў выніку клясавай барацьбы. «Усе факты мінулага кажуць, што неабмежаваная форма манархіі ўзьнікла з барацьбы паміж арыстакратыяй, абапіраючыся на дэмакратыю». Урад у сучаснай дзяржаве, гэта—„камітэт, складаемы з пануючай у ніжняй палаце партыі“.

Мы бачым тут, як Чарнышэўскі блізка падыйшоў да вучэньня К. Маркса. Яму гэта было, зразумела, значна цяжэй хоць бы таму, што ён здалёку толькі наглядаў вялікія клясавыя бойкі 1848-1849 гадоў, непасрэдным удзельнікам якіх быў Карл Маркс. Рух пралетарыяту ў Расеі Чарнышэўскі ня мог наглядаць. Гэта, зразумела, часткова адбілася і на яго вывадах.

У клясавай барацьбе ў Заходняй Эўропе ўсе яго сымпатыі былі на баку пралетарыяту. Закранаючы францускую рэвалюцыю 1848 году, ён пытаецца: якая кляса нацыі была адзіным адданым абаронцам рэспубліканскага мэтаду кіраваньня.—Толькі кляса працаўнікоў; апрача працаўнікоў, сапраўдныя рэспубліканцамі былі толькі некаторыя паасобныя людзі... Прыдушана будзе кляса, якая адна аддана рэспубліканскай форме—яна застанецца безабароннай, яна спыніць сваё існаваньне і з ёй умераныя рэспубліканцы загінуць самі».

Як-жа павінна ісьці, як адбываецца разьвіцьцё расейскай грамады? Перш за ўсё адбываецца масавая пралетарызацыя насельніцтва. «Маса працаўнікоў на ўсіх заводзках, фабрычных і рамясловых вытворчасьцях хутка пераходзіць у стан наёмных працаўнікоў, а ў галінах прамысловасьці, дзе найбольш удасканалены працэсы вытворчасьці, ужо цалкам перайшла ў гэта становішча». Чарнышэўскі прызнае нямінучым далейшае разьвіцьцё гэтага працэсу:

«Расея, дагэтуль мала ўдзельнічаўшая ў эканамічным руху, хутка ўцягваецца ў яго, і наш быт, які да гэтага часу заставаўся чужым уплыву эканамічных законаў, выкрываючых сваю магутнасьць толькі пры ўмове эканамічнай і гандлёвай чыннасьці, пачынае хутка падначальвацца іх сіле. Хутка і мы можа будзем уцягнуты ў сфэру поўнай чыннасьці закону канкурэнцыі».

Аб кааперацыі і працы.

Але калі капіталістычны лад прыводзіў да павялічэньня ліку пралетарыяў, дык павялічвалася і арганізаванасьць гэтых пралетарыяў: «лік пралетарыяў усё ўзрастае і галоўнае, узрастае іх сьвядомасьць у сваіх сілах і робіцца больш ясным іх разуменьне аб сваіх патрэбах».

Сацыялістычная перабудова грамады для Чарнышэўскага нямінуча. Яна адбудзецца, мабыць, як самастойны рух тэй клясы, якая больш усяго ў ім зацікаўлена, г. зн. пралетарыяту. Але Чарнышэўскі ўскладае вялікія надзеі на разьвіцьцё кааперацыі. Ён ведаў, што той рабочы рух, які ён наглядаў у Заходняй Эўропе, «гэта—яшчэ толькі зародак, які разьвіваецца, а калі ён разаўецца, тады яшчэ ня тое будзе». Пакуль ён разаўецца, трэба няўпынна прапагандаваць мэтад вытворчасьці, іменна кааперацыйны, які, па думцы Чарнышэўскага, мае вялікую перавагу ў параўнаньні з капіталістычным. У рамане «Что делать», у цэлым шэрагу артыкулаў ён зноў і зноў закранае гэта пытаньне.

З чаго-ж складаюцца будучыя асновы эканамічнага ўпарадкаваньня? Яны складаюцца з таго, што праца не павінна быць таварам; што чалавек працуе з поўнай пасьпяховасьцю толькі тады, калі працуе на сябе, а не на каго іншага; пачуцьцё пашаны сябе разьвіваецца толькі ставовішчам самастойнага гаспадара; што таму шукаць належнага дабрабыту працаўнія будзе толькі тады, калі зробіцца гаспадаром; што разам з тым, прынцып злучэньня працы і характар палепшаньня вытворчых працэсаў патрабуюць вытворчай адзінкі вельмі значнага разьмеру, а фізыялёгічная і іншыя прыродныя ўмовы патрабуюць злучэньня шмат якіх рознастайных вытворчасьцяй у гэтай адзінцы, і што таму паасобныя гаспадары-працаўнікі павінны аб'яднацца ў таварыствы». Але для яго, гэта—толькі частка таго, што павінна быць зроблена яшчэ пры буржуазным ладзе.

Чарнышэўскі не разьвіў поўнай тэорыі камунізму, не распрацоўваў праграмы: для гэтага ў яго ня было ўмоў. Але яго аграмадная праца крытыкі буржуазных эканамістаў заслужыла з боку Карла Маркса выключную пашану. Маркс вельмі сурова адносіўся да вучоных. Чарнышэўскага ён лічыў вельмі буйным мысьліцелем-вучоным, навучыўся парасейску, каб чытаць творы Чарнышэўскага на расейскай мове і не аднакраць выказваў сваю пашану Мікалаю Гаўрылавічу.

За „заняткі ня зусім чыстыя“.

Калі перачытываеш бічуючыя старонкі Чарнышэўскага па адрасу лібералаў, дык здаецца, што яны напісаны яшчэ толькі ўчора; яны цалкам накіраваны супроць тых паўлібералаў, паўсацыялістаў, якія, прыкрываючыся сацыялістычнымі сьцягамі, больш усяго спалохаліся сацыялістычнай рэвалюцыі, калі яна зрабілася фактам.

Як дыялектык, г. зн. мысьліцель, які разглядае рэчы, падзеі, зьявішчы ня ў тым выглядзе, у якім яны існуюць у кожную даную хвіліну, а ў іх разьвіцьці; як мысьліцель, які цэніць ня толькі ўменьне растлумачыць сьвет, але—галоўнае—уменьне вымяніць гэты сьвет,—Чарнышэўскі надаваў аграмаднае значэньне руху. «Рух ёсьць рэальнасьць, бо рух, гэта—жыцьцё, а рэальнасьць і жыцьцё—адно». Як гэта падобна на заўвагі Маркса, што «кожны крок сапраўднага руху важней за тузін праграм»!

„Важней усіх здабытых вынікаў,—кажа М. Г. Чарнышэўскі,—імкненьне да набыцьця новых, лепшых: важней усяго дапытлівасьць думкі, чыннасьць сіл“.

Чарнышэўскі ў поўным сэнсе слова—дэмакрат, асьмейвае і бічуе тых, хто лічыць, нібы рэвалюцыю можна зрабіць без эксцэсаў. Ён прыхільнік самых крайніх мер у рэвалюцыі. Усякая пал

ДА „ТЫДНЮ АБАРОНЫ“.

На шырокі шлях творчае працы.

(Артыкул Намесьніка Старшыні Рэвалюцыйнага Ваеннага Савету СССР і Наркома Ваенных і Марскіх Спраў т. УНШЛІХТА).

Пленум Цэнтральных Саветаў Саюзу ТДА-Авіяхіму СССР і РСФСР, які адбыўся ў красавіку, выявярнуў асаблівую ўвагу на слабы ахоп усяе масы членаў таварыства практычнай працай і яшчэ раз пацьвердзіў, што адной з асноўных умоў пасьпяховага разьвіцьця чыннасьці ТДА-Авіяхіму, як масавае 3-хмільённае арганізацыі, вылучаецца шырока разгорнутая і наладжаная па пэўнай сыстэме масавая праца.

Заваяваўшы сабе заслужаную папулярнасьць сярод шырокіх мас працоўных, «Тыдзень Абароны» ў гэтым годзе адбываецца пад лёзунгам разьвіцьця шырокае арганізацыйна-выхаваўчае працы ў масах. у адпаведнасьці ад папярэдніх гадоў грашовы збор у «Тыдзень Абароны» будзе выкарыстан на ўмацаваньне масавае працы ТДА-Авіяхіму.

Ператварыць ТДА-Авіяхім у сапраўды масавую арганізацыю савецкае грамадзкасьці, аказаць фактычную дапамогу ў справе максымальнага ўзмацненьня нашае абароназдольнасьці, разьвіцьця нашае прамысловасьці, узьнятьця культуры нашае краіны—усё гэта цяжкія і складаныя задачы, якія нельга ажыцьцявіць у кароткі тэрмін, нельга ажыцьцявіць бяз вынішчэньня дэлага шэрагу перашкод.

Адна з сур'ёзных цяжкасьцяй у нашай працы—гэта недастаткова поўная пагоджанасьць у працы, асабліва ў галіне ваеннае прапаганды і ваеннае падрыхтоўкі працоўных з палітасьветамі, прафсаюзамі і іншымі грамадзкімі арганізацыямі: да гэтае пары ў працы існуе роўнапрадпасьць, няма выразнага разьмежаваньня функцый, усё яшчэ не навучыліся эканоміць сілы і сродкі, усё яшчэ ня сумеем працаваць як трэба, ня можам дамагчыся максымальных дасягненьняў пры мінімальных выдатках сіл і сродкаў. Пара дамагчыся пагоджанае працы. Пара знайсьці агульную мову, працуючы для аднэй справы. Зьяўляючыся асноўнай грамадзкай арганізацыяй па ўмацаваньню абароназдольнасьці нашага Саюзу, ТДА-авіяхім натуральна павінен ажыцьцяўляць агульнае кіраўніцтва усёй працай у гэтай галіне. З гэтага, аднак, пакіл чынам не выцякае, што ТДА-Авіяхім прэтэндуе на манапольнае права арганізацыі стралковых гурткоў на фабрыках, заводах, прадпрыёмствах, установах. Зусім не. Усе арганізацыі, ведаючыя гэтай справай, да гэтае пары павінны весьці і разьвіваць сваю працу. Але патрэбна поўная ўвязка ва ўсёй гэтай працы, неабходна адзінства кіраўніцтва, адзінства мэтадаў працы. Толькі тады зможам мы дамагчыся ліквідацыі раўнапрадпасьці і нездаровае канкурэнцыі, зможам дамагчыся максымальнага эфэкту і тым самым вынішчыць адну з сур'ёзных перашкод на нашыраньня і паглыбленьня творчае працы нашага таварыства.

Цяжкасьці і недахопы не абмяжоўваюцца толькі гэтым. У Тыдзень абароны мы павінны палкрэсьліць неадпаведнасьць стан ТДА-авіяхімаўскіх арганізацый на вёсцы. Мы да гэтае пары не зьвяртаем вёсцы тае ўвагі, якой яна заслугоўвае. Мы не накіравалі туды лепшага кадру працаўнікоў. Мы ня выпусьцілі да гэтае пары масавае папулярнае даступнае для сялянскіх мас літаратуры. Мы, адным словам, не падышлі яшчэ шчыльнай тут да вырашэньня нашых асноўных задач.

Слабая наша праца сярод работніц, батрачак і працоўных сялянак. Тут трэба дамагчыся вострага пералому.

У надыходзячы «Тыдзень абароны» неабходна ў большай меры, чым да гэтае пары, завастрыць увагу на працу нашага таварыства і авіяцыйна-хімічнае галіны, дзе за апошні час мы грохі адсталі. Умацаваньне грамадзкае і фінансавае дысцыпліны зьяўляецца адной з важнейшых задач, якую мы ўсебакова павінны растлумачыць масам, аб'яднаным у шэрагах ТДА-Авіяхіму.

Разьвіваючы, паглыбляючы і пашыраючы сваю працу, выхоўваючы ўсё больш актыў, дасягаючы ўсё больш буйных вынікаў, мы ні на хвіліну не павінны забываць, што нед[illegible] у нас яшчэ вельмі шмат.

Разгортваньне шырокае нізавое крытыкі, крытыкі здаровае, дзелавое—самы правільны шлях да зьнішчэньня ўсіх адмоўных зьявішчаў у нашай працы. Гэты шлях выяўляе і выпраўляе ўсе памылкі і недахопы ў нашай працы, вырывае з карэньнем усякае праяўленьне казёншчыны і бюракратызму.

Умацаваньне арганізацыйнага касьцяка нашага таварыства, згуртаваньне мас вакол яго, нашчадная барацьба супроць усіх недахопаў, супроць бюракратычных, бяздушных адносін да жывое працы сярод мас—усё гэта павінна паслужыць базай для максымальнага разьвіцьця ў далейшай чыннасьці ТДА-Авіяхіму па ўмацаваньню абароназдольнасьці Савецкага Саюзу. У леташнім годзе Тыдзень Абароны ўзварушыў шырокія масы, выявіў вялізарны інтарэс іх да справы ваеннае падрыхтоўкі. У гэтым годзе мы ня можам абмежавацца гэтымі дасягненьнямі, трэба паглыбіць і арганізацыйна замацаваць іх; трэба каб мы атрымалі зусім рэальныя, практычныя вынікі ў галіне ваеннага навучаньня і выхаваньня працоўных. Неабходна, каб у стралковых гурткох, гурткох ваенных ведаў, паходах і на манэўрах, атрымаўшых такое шырокае разьвіцьцё пасьля першага тыдню абароны, мы рыхтавалі будучых байцоў Чырвонае арміі, здольных ня толькі ўзяцца за вяроўку для абароны Савецкага Саюзу, але і ўмеючых уладаць ёй.

Нам трэба сьпяшацца. І міжнародныя і ўнутраныя абставіны патрабуюць ад нас максымальнага напружаньня сіл і энэргіі для ўзьняцьця працы нашага таварыства на адпаведную вышыню. Чым больш складаныя і цяжкія гэтыя абставіны, чым больш вялізарныя задачы вырастаюць перад намі, тым больш узрастаюць роля і ўдзельная вага шырокае савецкае грамадзкасьці, тым большая адказнасьць ускладаецца на нас.

Пад ідэйным кіраўніцтвам камуністычнае партыі, пры актыўным падтрыманьні прафэсыянальных саюзаў, у поўным супрацоўніцтве з усімі грамадзкімі арганізацыямі мы адолеем перамагчы ўсе цяжкасьці і перашкоды і выйсьці на шырокі шлях ініцыятыўнае і творчае працы.

У Тыдзень абароны шматмільённыя масы працоўных, жыхары сёл, вёсак, гарадоў выйдуць на вуліцу дэманстраваць адзіную, непарушную волю да перамогі, гатоўнасьць аддаць сваё жыцьцё за ідэалы камунізму.

Масква.

Падрыхтоўка да „Тыдню Абароны“ па акругах.

У Полацкай акрузе.

Полацак, 13-7. Акрсавет ТДА-Авіяхіму рыхтуецца да правядзеньня «Тыдню Абароны».

На працягу кампаніі будзе праводзіцца газавабкурваньне сяброў ТДА-Авіяхіму.

14-га ліпеня адбудзецца ўрачыстае пасяджэньне акрсавету ТДА-Авіяхіму з удзелам прадстаўнікоў усіх арганізацый.

У гэты-жа дзень адчыняецца гарадзкая канфэрэнцыя ячэек ТДА-Авіяхіму.

15-га ліпеня адбудзецца дэманстрацыя, у якой прымуць удзел прафэсыянальныя і камсамольскія арганізацыі, а таксама атрады ТДА-Авіяхіму і Чырвонага Крыжу.

Увечары 15-га ліпеня адбудзецца інсцэніроўка і паветрана-хэмічны напад.

У часе „Тыдню“ адбудуцца стралковае спаборніцтва пінэраў гарадзкой арганізацыі і спаборніцтва гарадзкой арганізацыі ТДА-Авіяхіму.

22-га ліпеня адбудзецца масавы выезд прафсаюзаў у лягеры. Прэзыдыум акрсавету ТДА-Авіяхіму пастанавіў праводзіць з 10-га ліпеня да сканчэньня «Тыдню Абароны» абгляд усіх ячэек гарадзкой арганізацыі ТДА-Авіяхіму.

У часе кампаніі па акрузе адбудуцца скарбоначныя зборы ў карысьць фонду абароны.

У Мазырскай акрузе.

Мазыр, 13-7. Па акрузе зараз разгарнулася падрыхтоўка да правядзеньня кампаніі „Тыдню Абароны“.

З гораду і мястэчак акругі адбываюцца выезды ў падшэфныя вёскі для правядзеньня сходаў сялян з дакладамі аб „Тыдню Абароны“ і масавага ўступленьня ў ТДА-Авіяхім.

14-га ліпеня адбудуцца скарбоначныя зборы, абходы з падпіснымі лістамі.

Апроч таго, па прадпрыёмствах адпрацоўваюцца па 2 гадзіны звышчасовай працы ў карысьць фонду абароны.

15-га ліпеня арганізоўваецца мітынг-дэманстрацыя, а таксама пікніка гульні ў садох, па плошчах, дзе адбудуцца спаборніцтвы ячэек, выступленьні сангурткоў і хэмгурткоў.

У працягу «Тыдню Абароны будуць праводзіцца па гораду агульныя сходы настаўнікаў з дакладамі аб іх ролі ў абароне краіны.

Апроч таго, у часе кампаніі адбудуцца па гораду, мястэчках і вёсках шырокія нарады камсаду запасу, дэмабілізаваных чырвонаармейцаў і былых чырвоных партызан па пытаньні іх практычнага ўдзелу ў працы ТДА-Авіяхіму.

21-га ліпеня адбудуцца гарадзкія і раённыя паходы арганізацыі ТДА-Авіяхіму сумесна з камсамольскімі арганізацыямі.

Па гораду ўжо праводзяцца агульныя сходы рабочых і служачых з дакладамі аб „Тыдню Абароны“ і далейшыя задачы па ваенізацыі насельніцтва.

Домбалеўцы на начных занятках.

Рабочы Барысава добра ўцяміў, што ворагі з усіх бакоў точаць зубы, каб напасьці на савецкую краіну, а таму актыўна рыхтуецца да абароны сваей сацыялістычнай бацькаўшчыны.

Рабочыя гуты „Домбаль“ у першай палове ліпеня былі на начных ваенных занятках. Тэма занятак была—рота ў абароне. Камсклад палкшколы кіраваў гэтымі заняткамі. Заняткі прайшлі цікава і далі станоўчыя вынікі як для рабочых, так і для курсантаў палкшколы, якія былі ў ролі адзяленных камандзіраў.

Гэта першы вопыт у Барысаве, калі рабочыя, пад кіраўніцтвам камскладу, выходзяць у поле на тактычныя заняткі ды яшчэ і ноччу. І трэба сказаць, што рабочаму абрыдла слухаць сухія даклады ды лекцыі ў вайсковых куткох, а ён патрабуе практыкі. Вось чаму камсклад палкавой школы добра адгукаецца аб праведзеных занятках.

Адсюль вынікае, што і іншым як прадпрыёмствам, так і воінскім часьцям патрэбна вылезьці з вайсковых куткоў на сьвежае паветра, на прыроду. Асабліва для гэтай мэты патрэбна скарыстаць Тыдзень абароны. Ч.

Не падкачаем і сёлета.

4 чэрвеня ў лягеры адбылася нарада актыву палка па ўсіх галінах работы—сэкратароў парт'ячэек, асоавіяхімскі актыў, мопраўскі актыў, вайск раўскі актыў і паліткіраўнікі рот. На нарадзе прысутнічала каля 100 чал. Гэтаму актыву быў зроблен інструкцыйны даклад камісарам палка на тэму: тыдзень абароны і аслабаненьне Беларусі. Між іншым дакладчык заўважыў наступнае: Тыдзень абароны ў мінулым годзе прайшоў пад знакам небясьпекі вайны з боку сусьветнай буржуазеі. Тыдзень абароны ў мінулым годзе прайшоў пасьпяхова і даў станоўчыя вынікі. Галоўныя з іх: масы яшчэ больш згуртаваліся вакол камуністычнай партыі, арганізавалі шмат ціраў, ваенгурткоў і пабудавалі на сабраныя сродкі не адну сотню аэраплянаў і інш. Гэты Тыдзень абароны, які праводзіцца з 15 па 22 ліпеня, павінен прайсьці пад знакам дапамогі дзяржаве сродкамі і замацаваньня дасягненьняў па ваенізацыі насельніцтва.

Па дакладу было шмат пытаньняў.

У пастанове адзначылі, акрамя правядзеньня ў жыцьцё пляну абароны бюро ТДА-Авіяхіму палка, праводзіць гутаркі сярод чырвонаармейцаў, замяніць літаратуру ў ротных бібліятэчках, вайскорам арганізоўваць чыр-цаў па пытаньнях абароны цераз ільлічоўкі і наогул друк і г. д.

У мінулы год у нашым палку Тыдзень абароны прайшоў пасьпяхова і мы акрамя вярбоўкі членаў у Авіяхім з навабранцаў сабралі каля 100 руб. сродкаў у фонд «Наш адказ Чэмбэрлену».

Дзякуючы праведзенай нарадзе ўсяго актыву палка, загадзя можна спадзявацца, што і ў гэтым годзе мы не падкачаем, а правядзём тыдзень абароны так, што аж Керзон перавернецца ў труне ад злосьці і Чэмбэрлен з Пілсудскім не пасьпяць спакойна некалькі начэй.

Вайскор.

ВУЛЬСКІЯ АДМІНІСТРАТАРЫ.

Назіраўся зажым у партарганізацыі.—Нядбайныя адносіны РК і РВК да апошніх кампаній.—Крэдытамі карысталіся заможнікі.—Вечары спойкі, а ня спайкі.

Далёкая адлегласьць Вульскага раёну ад акруговага цэнтру—Полацку, слабая жывая сувязь і кіраўніцтва з боку акругі—усё гэта спрыяла цэламу шэрагу ненармальнасьцяй у райённым савецкім апараце і райпартарганізацыі.

У Вульскім раёне назіраецца вялікі зажым і галавацяпства з боку кіраўнікоў партарганізацыі. Так, напрыклад, у габінэт сэкратара РК, а асабліва апорга, партыйцы баяцца заходзіць. Амаль адсутнічала жывая сувязь райкому з ячэйкамі. Напрыклад, у раёне маецца 3 сельпартячэйкі, а сэкратар райкому за год пабываў толькі ў 2 ячэйках па аднаму разу. Апрача гэтага, назіралася склока паміж сэкратаром райкому, апоргам і старшынёй райвыканкому.

Такое галавацяпства і камісарства з боку раённых працаўнікоў спрыяла паслабленьню працы ўсіх раённых арганізацый, што асабліва адбілася на правядзеньні апошніх палітычных кампаній у вёсцы.

Апошнія палітычныя кампаніі (самаабкладаньне, сяўба і інш.) **зрабілі належны экзамен раённым працаўнікам і выявілі іх працаздольнасьць у выкананьні ўсіх дырэктыў партыі і ўлады.**

Каб ахарактарызаваць дзейнасьць у гэтых кампаніях РК і РВК, досыць будзе спыніцца на правядзеньні самаабкладаньня і пасяўной кампаніі.

Спачатку большасьць вёсак адмовіліся ад самаабкладаньня, толькі таму, што сярод сялянства, асабліва сярод беднаты, ня было праведзена папярэдняй падрыхтоўкі. Сам старшыня райвыканкому ў часе ўсёй кампаніі ніводнага разу не выяжджаў у вёску. Толькі тады, калі ў раён прыехаў сэкратар АВК, самаабкладаньне было праведзена амаль ва ўсіх вёсках. Цікава адзначыць і тое, што бязьдзейнасьцю РК і РВК карысталіся ўсялякія элемэнты (кулакі, ксяндзы) і зрывалі правядзеньне самаабкладаньня.

Пляны пасяўной кампаніі далей РВК нідзе ня былі; сельсаветы аб пляках нічога ня ведалі, а паміж КСУ і крэдытнымі арганізацыямі адсутнічала ўвязка. У выніку такой пастаноўкі працы, **крэдытамі карысталіся заможныя слаі вёскі, і атрымлівалі крэдыты па некалькі раз.** Беднота ў пасяўную кампанію была слаба ўцягнута і часам не атрымлівала крэдытаў.

Адноічы на пашыраным пленуме Райвыканкому, які адбываўся ў Хоцімскім сельсавеце, старшыня АКК—РСІ т. Кофцароў рабіў даклад аб працы РСІ. На гэтым пленуме сяляне гаварылі аб тым, што крэдытныя т-вы трымаюць сувязь з кулацтвам; беднота крэдытамі не задавальнялася. РВК да галасоў ня прыслухоўваўся і ня прымаў амаль ніякіх мер да зьнішчэньня гэтых недахопаў. Пасьля пленуму сяляне падалі т. Кофцярову шмат заяў, у якіх цалком усё пацьвярджаецца, аб чым мы пісалі вышэй, і дало магчымасьць АКК—РСІ вывяць яшчэ цэлы шэраг недахопаў у Вульскім раёне.

Апрача ўсяго гэтага, назіралася п'янства сярод адказных прэцаўнікоў раёну.

Былы апорг райкому Небрадоцкі быў дыктатарам і арганізатарам вечароў спайкі, якія пераходзілі ўвечары пагалоўнай спойкі. Такія вечары «спайкі» рабіліся вельмі часта; на гэтых вечарох заўсёды прысутнічаў актыў. Гэта п'янка даводзіла да скандалаў і сваркі. Больш за ўсіх спрачаліся старшыня РВК Куксёнак і Небрадоцкі, спрэчкі і сварка ў іх была аб тым—хто павінен быць арганізатарам і дыктатарам на вечарох «спайкі».

Гэтыя вечары «спайкі» спрыялі сувязі з мяшчанствам і розным элемэнтамі, якія, пры дапамозе «ответственных», паступалі на працу.

АКК-РСІ прыняла цэлы шэраг мерапрыёмстваў **да аздараўленьня кіруючага складу** Вульскай партарганізацыі і савецкага апарату.

У райён выяжджала камісія АКК-РСІ, якая ставіла свае даклады на партыйных сходах. На сходах назіралася нябывалая актыўнасьць з боку партыйцаў.

Сэкратар райкому і апорг зьняты з працы, зроблены перавыбары бюро ячэек і прыняты меры да аздараўленьня савецкага апарату ў райёне.

Я. Зб.

Савецкае будаўніцтва.

Што робіцца на „крэсах“.

Крэсамі Пухавіцкі РВК называе самыя адлеглыя свае сельсаветы: Шацкі—40 вёрст і Сяргеевіцкі 30 вёрст. Такая адлегласьць ад райёну не дае магчымасьці ва ўсё ўнікаць, усё ведаць, але-ж...

Калі мы возьмем школы, то яны знаходзяцца бадай усе ў дрэнным становішчы. Патрабуюць яны рамонту, а грошай кот наплакаў і па чутках ня будзе. Такое хворае зьявішча назіраецца ня толькі ў Пухавіцкім раёне, але і ў другіх раёнах нашай акругі.

Два гады таму назад адзін раён перад другім стараўся адчыніць як мага больш школ.

Праўда, гэта рэч надрэнная і яе трэба было-б вітаць, але толькі тады, калі гэтыя школы адпавядалі-б свайму прызначэньню, калі-б яны мелі выстарчаючую колькасьць падручнікаў, падсобнікаў і больш-менш адпавядаючыя памяшканьні.

Школы гэтага ня маюць ды і не маглі мець пры тагачасных рэсурсах.

Між тым канкурэнцыя паміж раёнамі з кожным годам узрастала. Новыя школы адчыняліся, траціліся сякія такія сродкі на іх, а існуючыя даўно пабудаваныя школы, развальваліся, бо мала хто на іх зварачваў увагу.

А новыя будынкі пад школы пачыналі будаваць і на палавіне, як кажуць, дарогі кідалі незакончанымі.

Прыкладам гэтага можа быць будынак, прызначаны для Церабсельскай 2-хкамплектавай школы Сяргеевіцкага с-савету.

Сяляне гэтае вёскі 16 чэрвеня 1926 г. на агульным сходзе далі згоду неравезьці з урочышча Рабінаўка будынак пад школу, ня гледзячы на адлегласьць у 25 кілёмэтраў.

Школа ў іх была, яна і цяпер ёсьць, 7 на 8 аршын, старэнькая маленькая, нізенькая, а вучняў было, як тых селядцоў у бочцы—70—80 чалавек.

Быўшы Шацкі РВК даў загад на перавозку будынку з Рабінаўкі, будынак быў немалы: 32× 10 мэтраў.

Перавозка пачалася з 1-га ліпеня 1926 г. Усе 75 гаспадароў вёскі Церабелі шчыра ўзяліся за перавозку. Удзень працавалі на сенакосах, жніве, а ноччу ехалі за будынкам.

Прайшоў ліпень і ўвесь будынак быў на месцы; бо бадай кожны гаспадар зьязьдзіў 8—9 раз.

Па пісьмовай умове 15-УІ-26 г. праца па будаваньню школы Шацкім РВК была здадзена падрадчыку вёскі Серадзіна т. Парэчыну, за якую РВК павінен быў заплаціць Парэчыну 1450 руб.

За тэрмін з 15-УІ па 1-ХІ гэты будынак быў зложаны, пакрыты кавалкамі страхі, паложана столь, устаўлены вокны (бяз шыб), дзьверы, загатоўлены дошкі на падлогу ў абодвы клясы школы. На ўсе печы маецца ў патрэбнай колькасьці цэглы, перавезеная з тэй-жа самай Рабінаўкі.

За працу Парэчын атрымаў 700—800 руб., прыблізна палову ўмоўнай сумы і праца на гэтым спынілася. Будынак у такім становішчы і па гэты час стаіць, гніе, бо страха была парэзана на кавалкі, не палатана, а ў дабавак кавалак сарваў вецер і такім чынам дае яшчэ большую магчымасьць псавацца памяшканьню.

Што-ж думае рабіць Пухавіцкі РВК з гэтым будынкам у далейшым?

Як віцаць—нічога. На школьнае будаўніцтва вызначана толькі 3000 руб. і РВК намеціў пабудаваць у гэтым годзе дзьве плянавыя школы (вядома, не за гэтыя грашы, бо было-б вельмі дзіўна), а такія будынкі, як у Церабелі—хай гінуць.

На мой погляд трэба закончыць будаваньне школ пачатых, адрамантаваць старыя, а тады брацца за новыя.

Трэба, каб нашы вышэйшыя ўстановы далі па гэтай справе сваё заключэньне і канчаткова вырашылі пытаньне аб заканчэньні школы, маючы на ўвазе наліччa таго матар'ялу, які зараз падрыхтаваны.

Асьветнік.

„Гібкасьць“ апарату.

Наш Лагойскі раён досыць хлебны раён. Заўсёды свайго хлеба хапала. Сёлета з прычыны затрымкі хлеба верхавінай вёскі—заможнікаў, і некаторыя хібы ў хлебазагатоўчай кампаніі—і ў нашым райёне хлеба стала не хапаць. Заможнікі цяпер пазычаюць хлеб бедняку з умовай аддачы ўвосень за пуд-два, а то прадаюць па 3-4½ р. з пуд. У м. Лагойску ў каапэрацыі хлеба няма. Калі дастануць некалькі пудоў жыта, або мукі,—то чарга за хлебам. Апошняя пастанова Наркамгандлю, здаецца, павінна была-б спыніць гэту недарэчнасьць, бо на тэрыторыі райёну шмат млынаў і пры своечасовым і правільным налажаньні памольнага збору, адна, Лагойская каапэрацыя, зьбірала-б у месяц некалькі сот пудоў хлеба.

Як-жа праводзіцца гэта пастанова Наркамгандлю ў жыцьцё?

Вось некалькі момантаў:

Яшчэ 30-Y Аргандаль піша распараджэньне за № 1393 па райёнах аб узіманьні ў млынох платы за помол натурай. У РВК гэта адносіна атрымоўваецца 7-6 і **спакойна ляжыць у кіпах канцэлярскіх папер да 16-6 і толькі 16-6 РВК зьнімае з гэтае адносіны копіі і рассылае па сельсаветах,** а як гэтыя пастановы ідуць у сельсавет—убачым далей; досыць сказаць, што **Юркаўскі сельсавет атрымаў гэтую адносіну 27-6 (№ 4632). Бачыце—акурат праз месяц.**

Наркамгандаль выдае абавязковую пастанову № 44 аб нормах узысканьня платы за помол. Пастанова друкуецца ў нашым дзяржаўным органе „Савецкая Беларусь“ за 8-6, якую атрымоўваюць і РВК і ўсе сельсаветы. Надрукована 8-6, **а толькі 21-6 РВК дадумаўся зьняць копіі і паслаць па млынох.** Да гэтага часу цэлыя два тыдні пастанова валялася то ў стале машыністкі, то ў паперах камхозу.

21-6 пісаў РВК нормы. Некалькі дзён ішлі яны ў сельсаветы і млыны. Нават самы большы млын у райёне Міхалова—Крэмера побач з Лагойскам **атрымаў гэтую пастанову толькі 29-6.** Калі атрымалі іншыя—баюся сказаць.

Гэта так цягнуўся працэс канцэлярскай пісаніны. Што-ж і калі практычна стала рабіцца? А вось: Лагойскі млын, знаходзячыся ў мястэчку пачаў фактычна ўзімаць фунты з 26-6, у які дзень ім і была атрымана пастанова № 44 (прыпомніце, пасылалася з РВК 21-6!). Іншыя млыны да апошніх дзён нічога не рабілі, калі некаторыя і пачынялі ўзысківаць плату за помол натурай, дык вучоту ніякага не вялі. Паказвалі каапэрацыі колькі хацелі і толькі 30-6 РВК разаслаў квіт. кніжкі дзеля вучоту па млынох, а яшчэ 2-га ліпеня ўласнік Міхалоўскага млыну, што побач з РВК, хадзіў па Лагойску і шукаў каго-небудзь, каб прачытаў прысланую яму копію пастановы Наркамгандлю № 44 і растлумачыў колькі браць за помол бо ён не разьбіраецца. Хадзіў і, напэўна пісьменнае асобы, якая-б прачытала і растлумачыла, не знайшоў, бо так «рыкаўская машынка» надрукавала, што ніхто не прачытае.

Райвыканком, а разам з ім і сельветы, да апошніх дзён чэрвеня нічога ў гэтым напрамку не рабілі і толькі ў канцы чэрвеня пачалі друкаваць, рассылаць паперкі, слухаць «даклады» каапэратараў аб забясьпечаньні хлебам і выносіць ім выгавары за «бязьдзейнасьць» (а хто бязьдзейнічаў?). У выніку ўжо ліпень м-ц, хлеба не хапае, чаргі ў каапэрацыі не ліквідуюцца, а дасягнуць гэтага можна было даўно, бо адзін толькі млын Цна (праўда першы ў райёне) за сем дзён з 21 па 29-VI сабраў за помол каля 200 пуд. жыта, а колькі за м-ц? А колькі сабралі ўсе млыны разам?

Гэтага, здаецца, досыць, каб паказаць «гібкасьць» нашага апарату, наколькі сур'ёзна на мясцох бяруцца за выкананьне пастаноў вышэйшых органаў улады і тых пастаноў, якія ліквідуюць кожнадзённую нашу балячку.

Было-б яшчэ «з горам папалам», каб гэта было толькі ў Лагойскім райёне. Тады-б яму як «прыкладнаму ў бюракратызьме» можна было-б выдаць якую небудзь «прэмію»—і ўсё, але калі паглядзець, дык нешта падобнае знойдзецца і ў іншых.

Я. К.

Лагойск, Меншчына.

Трэба тлумачыць законы.

Многія члены сельсаветаў мала знаёмы з савецкімі законамі. Часта бывае скрыўленьне закону на вёсцы, і большасьцю з прычыны няведаньня законаў.

Калі селянін не знаходзіць спачатку належнага вырашэньня сваёй справы, яго ахапляе нейкая апатычнасьць. І, урэшце, ён паракае на савецкую ўладу.

Выходзячы з гэтага, я прапаную:

1. Склікаць, хоць пэрыядычна—адзін раз у месяц членаў сельсавету і актыў вёскі на тэрыторыі кожнага сельсавету і тлумачыць ім законы самыя неабходныя для вёскі.

2. На кожным пленуме сельсавету ставіць пытаньне аб тым ці іншым законе.

Праводзіць гэтую працу, канешне, больш рацыянальна—зімой, а на [illegible] чымасьці можна і летам.

Тэфс.

Шклоўскі райён.

ХРОНІКА.

Сходы прысьвечаныя „Тыдню Абароны“.

У сучасны момант па гораду Менску праходзяць па прадпрыёмствах і ўстановах сходы, прысьвечаныя «Тыдню Абароны».

Сходы праходзяць вельмі актыўна. Ува многіх прадпрыёмствах гэткія сходы ўжо адбыліся.

Удзельнікі ўсебеларускай спартакіяды—да „Тыдню Абароны“.

15-га ліпеня адчыняецца Ўсебеларуская спартакіяда, у якой прымуць удзел да 900 чал. з усіх акругаў БССР і вайсковых часьцей БВА.

Удзельнікі спартакіяды прымуць удзел у агульна-гарадзкім парадзе, які адбудзецца ў нядзелю 15-га ліпеня.

Удзел менскіх ячэек Аўтадору ў „Тыдню Абароны“.

Менскія ячэйкі Аўтадору прымуць актыўны ўдзел у правядзеньні кампаніі „Тыдню Абароны“.

У часе кампаніі ячэйкі наладжваюць вечары і праводзяць сярод сяброў збор сродкаў на набудову аўтамабілю.

ДЗІЦЁНАК.

1. (Пераклад з украінскай мовы).

Здавалася, што ўсё мястэчка перавернута дагары нагамі. Здавалася, што так стаяць яму было нялоўка, яно было суровае, крывава-напружанае, як апошняя бойка. Нехта гуляў з ім—і перакуліў гэтыя домікі. З дамоў высыпаліся ўсе, а крамы вытрахнулі на вуліцы свае вантробы і стаялі зьдзіўлена-пустыя. Са звар'яцелымі ад жаху вачмі людзі мяккімі, зьвярынымі крокамі бегалі, аглядаліся ўдоўж парканаў. Толькі гэта ня людзі, а «жыды». Іх цяпер ня лічаць за людзей,—гэта статак, адзічэўшы ад роспачы.

Трывожна, як раптоўны стрэл, дзесьці біліся сэрцы. Дзесьці званілі ў боны і перакідваліся ў паветры грудзіны—гэтыя сталыя прадвесьнікі крыві, векавыя людаеды. Нават сонца пахабна разьляглося на пушыстай пярыне неба і абмывала сваю рожу ў асеньніх праменьнях.

Калі-ні-калі—на вуліцах зьяўляўся маскарад—п'яныя салдаты, з песьнямі, апранутыя ў жаночыя капоты, плацьці, маліцьвенныя, пярэстыя тогі.

З пустых, перакуленых яўрэйскіх хат нясьліся выкрыкі, і ведалі яўрэі, што сёньня—апошні судны дзень для гэтага прадмесьця. Троці дзень—ды заўтра ня будзе каго рэзаць, а рака ад яўрэйскіх трупаў выйшла з берагоў. Гэтае прадмесьце—апошняе.

Тут з вялікага дому ўцёк багаты купец Рогаў і сюды зьбегліся ўсе, каму ня было куды схавацца. Беднота зьбілася ў пакоях, на чардаку, у пуні, каб памерці ўсім разам. У бляды, сьмяротна-застыгшых вачох—сухіх і чырвоных—ужо ляпта няўхільнасьць.

Усё рабілася шашкамі, штыхамі, кінжалами—рэдка стрэлам. Быў загад берагчы набоі. Што-ж, калі жыцьцё чалавека таньней за набой!..

Статак загнаных у гэты чырвоны дом яўраў ня верыў у цуда, а чакаў нямінучага. У пакоях панаваў непарадак безнадзейнасьці, тупы, як гэтыя людзі.

Толькі ля столу над Абрамчыкам схілілася маці з сухімі, выплаканымі вачыма, з пасмамі кудлатых, крэпкіх валасоў з-пад хусткі, у глыбокіх, вымучаных зморшчынах...

Гаварыла маці:

— Ідзі, ідзі, сыночак, Абрамчык для ўсіх... вось, паглядзі колькі... усёроўна сьмерць, сыночак, тут. А там... можа запытаюць, скажы—Сярожа Рогаў, рускі, перакэсьціся, сыночак і пакаж ім гэты крыжык. Сыночак мой... скажы—Сярожа Рогаў—і вясёла ўсьміхніся, загавары...

Надзела яму на шыю вялікі срэбны крыжык і абразок.

Абрамчык прарыстыя, ружовыя пальцы паклаў на шнурок, вочы ў яго дарослыя, суровыя, як ва ўсіх бардатых, што навакол, а ў вачох—не надзея, а сполах.

Якая надзея—выразалі ўсіх, засталіся яны...

Сказаў Абрамчык:

— Мама... Ну, а калі скажу... калі ўсьміхнуся, а яны зарэжуць? Страшна... Ісаку Ломбергу рэзалі глотку на рынку... я бачыў... Мама... страшна!..

Суха і хутка зашчоўкалі дробныя, мышыныя, войстрыя зубкі Абрамчыка, зашчоўкалі ад страху, як ад голаду. Гэтымі зубамі ён валавяную пшэмбу можа перакусіць і перагрызьці шпагат,—ён такі!..

А ў маткі сагнуліся даўгія пальцы з чорнымі кіпцямі, схапіла яна сябе за пасмы валосьсяў і застыгла так з вуклом нехта крыкнуў і заскакалі, загойсалі перад ёю сьцены, людзі...

— Пайдзі, Абрамчык... Хай табе будзе шчасьце... Яны ўжо ідуць. Усьміхніся, скажы—Сярожа Рогаў...

Абрамчык пальцамі прарыстымі забегаў па шнурочку, сказаў:

— Пайду...

Раступіліся. Ён хутка выйшаў. Маленькі такі. Чакалі яўрэі. Блядым раўзвом роту цалавалі-б зямлю—толькі-б выратавацца...

2.

На вуліцы Абрамчык узьлез на лавачку. Сухотная восень кашляла крывёю кляновых лістоў. Застыла восень на платох, на невядомых дарогах. На вуліцы прабег сабака, ніяка апусьціўшы да зямлі аскаленую морду. А здалёку цягнулася карова, грызучы сухі бур'ян.

З нейкіх вуліц перакатваліся п'яныя выкрыкі. Абрамчык сядзеў. Нечакана—гоман гучны з-за вугла—затупаў і жвава выйшаў натоўп у салдацкіх шынэлях з какардамі і пагонамі, двое п'яных. П'яны, з чорнымі вусамі, малайцавата апавядаў:

— Нейкая такая... Сьвятая... Нават, нялоўка стала... Не тае...

Тады я кажу: пакажы мне... Ха-ха... Павярнулася, падняла юбкі і паказала... Паслухмяная!.. А, кажу, дык ты зьневажаць нашу дабравольчаскую армію? Паказваць зад салдату?.. І жыва ўправіўся...

— На гэты чырвоны дом паказвалі... Бач—пралетатар... хэ! сядзіць... Запытай-ка!

Чорнавусы бліжэй да Абрамчыка:

— Ты чый тут сядзіш?...

— Я Сярожа Рогаў, купца сын, вось з гэтага дому. Далі-бог—і крыжык ёсьць...

Дзіўлюся на вуліцу... Далі-бог!..

Абрамчык нязвыкла перахрысьцыўся. Падзівіліся на яго, падышоў бліжэй салдат з шырокімі, як вуліца, плячыма, мяккаю даўгою барадою, шэрымі, нудными вачмі і тварам, падзяўбаным воспаю. Сказаў:

— Бач... наладзец, вось такі самы ў мяне Косьцік... Ну, як выліты... І, братка, цікавы такі: вершы, пацеркі напамяць гаворыць, а казкі любіць ды розныя гісторыі—і боршчам не частуй... Даўно ня бачыў, што ён там зараз?.. А ты можаш напамяць гаварыць?

— Магу... Я і чытаць крыху ўмею...

— Іж, хуткі які... На табе за гэта арэхаў. Яны хоць і пархацкія, але добрыя, смажаныя, самае што па тваіх зубох... Маладзец хлапчынка!

Салдат старонна і асьцярожна ўзяў яго на рукі, падняў і паставіў на лавачку, даў арэхаў. Абрамчыку стала зусім ніштo сабе з гэтым салдатам; ды і зусім яны ня страшныя... Ён пачаў грызьці арэхі. Салдаты хваліліся адзін аднаму, а бардаты ўсьміхаўся:

— І вось, братка, такі жоўжык, Косьцік, а сур'ёзна мяне, бацьку, вучыць...

Хэ-хэ-хэ!..

Засьміяўся ў вусы, разгладзіў бараду, а Абрамчык паклаў свае пальцы на валасатую руку і смакуе арэхі; рэшта салдат круцілі цыгаркі з добрага тытуну.

Барадаты дзядзька весела ўсьміхаўся:

— Чытаеш, гаворыш?.. Маладзец! І—і... як цябе... ды як, кажаш, цябе зваць?

— Абрамчык!—весела і звонка адказаў хлапчук.

На момант усе змоўклі, а чорнавусы ня вытрымаў, стральнуў лютымі вачыма, крыкнуў, аж сьлінаю брызнуў у твар дзіцяці:

— Шмаркач! Пархатая... сабака... га?.. Маціў тут...

Скрывіўся твар у хлапчука... Забегалі чорныя жучкі вачэй па тварах салдат.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Палажэньне

пра дзяржаўную статыстыку БССР.

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭНЬНІ.

1. На Цэнтральную Статыстычную Управу БССР ускладаецца рэгуляваньне ўсёй статыстыкі на тэрыторыі БССР, агульнае кіраваньне, аб'яднаньне і кантроль статыстычных работ, прадугледжаных агульнарэспубліканскім плянам гэтых работ і беспасрэднае вядзеньне статыстычных апэрацый, паводле гэтага палажэньня і асобных заданьняў ураду БССР і Цэнтральнае Статыстычнае Управы БССР.

2. Цэнтральнай Статыстычнай Управе БССР даюцца ўсе правы аб'яднаных народных камісарыятаў, паводле Канстытуцыі (Асноўнага Закону) БССР і агульнага палажэньня аб народных камісарыятах БССР.

3. Кіраўніку Цэнтральнае Статыстычнае Управы БССР даецца права ўнаўважнага агульнасаюзнага народнага камісарыяту: у галіне вядзеньня і распрацоўкі ўсесаюзных перапісаў і выкананьня спэцыяльных заданьняў ЦВК Саюзу ССР і тады, калі пастановамі ЦВК Саюзу ССР прадугледжана выкананьне адпаведных заданьняў паводле гэтага артыкулу.

4. Агульна-саюзныя статыстычныя работы на тэрыторыі БССР выконваюцца Цэнтральнай Статыстычнай Управай БССР пад агульным кіраўніцтвам і паводле праграмы Цэнтральнае Статыстычнае Управы Саюзу ССР.

Увага: Праграмы агульнасаюзных статыстычных работ могуць дапасоўвацца да мясцовых умоў Цэнтральнаю Статыстычнаю Управаю БССР з тым, каб была захавана магчымасьць арабіць агульнасаюзную зборку. Зьмены тэрмінаў правядзеньня агульнасаюзных статыстычных работ дазваляюцца толькі пасьля ўгадненьня з Цэнтральнай Статыстычнай Управай Саюзу ССР.

II. ПРА КАМПЭТЭНЦЫЮ ЦЭНТРАЛЬНАЕ СТАТЫСТЫЧНАЕ ЎПРАВЫ БССР.

5. Да кампэтэнцыі Цэнтральнае Статыстычнае Управы БССР належыць:

а) ажыцьцяўленьне пастаноў Зьезду Саветаў БССР, Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР, яго Прэзыдыума, Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады пры СНК БССР па пытаньнях статыстыкі;

б) узгадненьне агульнарэспубліканскіх перспэктыўных і гадавых плянаў статыстычных работ і падача іх, пасьля зацьверджаньня Саветам Народных Камісараў БССР, на разгляд Цэнтральнае Статыстычнае Управы Саюзу ССР, для ўзгадненьня з агульнасаюзным плянам статыстычных работ і ўключэньня ў яго;

в) складаньне праграм і плянаў арганізацыі асобных статыстычных абсьледаваньняў і перапісаў, якія маюць агульнарэспубліканскае значэньне, і падача іх на ўстаноўленым парадку ў Цэнтральную Статыстычную Управу Саюзу ССР, для ўзгадненьня з агульнасаюзным плянам статыстычных работ;

г) правядзеньне на тэрыторыі БССР усесаюзных і агульнарэспубліканскіх перапісаў і распрацоўка матар'ялаў гэтых перапісаў.

Увага. Удзел Цэнтральнае Статыстычнае Управы БССР у распрацоўцы сабраных im матар'ялаў усесаюзных перапісаў вызначаецца ў кожным асобным выпадку Цэнтральнай Статыстычнай Управай Саюзу ССР.

д) складаньне балянсу народнае гаспадаркі БССР цалкам, хлебафуражнага балянсу і балянсаў іншых прадуктаў сельскае гаспадаркі;

е) выкананьне статыстычных работ па спэцыяльных заданьнях ураду БССР;

ж) зьбіраньне і распрацоўваньне ў агульнарэспубліканскім маштабе статыстычных матар'ялаў, сабраных падпарадкаванымі ЦСУ БССР мясцовымі статыстычнымі органамі, а таксама народнымі камісарыятамі і інш. цэнтральнымі ўстановамі і прадпрыёмствамі БССР, апроч матар'ялаў ведамсьцьвенага апэрацыйнага падліку;

з) зацьверджаньне праграм і парадку зьбіраньня і распрацоўваньня статыстычных матар'ялаў народнымі камісарыятамі і іншымі цэнтральнымі ўстановамі БССР, а таксама прадпрыемствамі і арганізацыямі агульнарэспубліканскага значэньня;

і) арганізацыя падпарадкаваных Цэнтральнай Статыстычнай Управе БССР мясцовых статыстычных органаў і агульнае кіраваньне іх дзейнасьцю, разгляд і зацьверджаньне плянаў праграм іх работ;

к) ажыцьцяўленьне мерапрыёмстваў для пашырэньня статыстычных ведаў і падрыхтоўкі кадру статыстычных працаўнікоў, у паасобку, арганізацыя навучальных і навучальна-апаможных установаў па статыстыцы, такіх як: статыстычных курсаў, сэмінараў, бібліятэк, габінэтаў і інш;

л) дача статыстычных зьвестак і даведак на запытаньнях Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР, Савету Народных Камісараў БССР, Эканамічнае Нарады пры СНК БССР і цэнтральных установ іншых саюзных рэспублік; дача такіх-жа зьвестак і даведак на запытаньнях Дзяржаўнай Плянавай Камісіі пры СНК БССР і ведамстваў БССР тады, калі гэта не патрабуе дадатковых статыстычных работ;

м) выданьне статыстычных штогодзікаў, бюлетэняў і іншых перыядычных выданьняў, зьбіранкаў перапісаў, абсьледаваньняў, а таксама асобных статыстыка-эканамічных зборнікаў, абглядаў, манаграфій і іншых навуковых і папулярных работ па статыстыцы.

6. Цэнтральнай Статыстычнай Управе даецца права:

а) патрабаваць ад усіх дзяржаўных, кааперацыйных і грамадзкіх установ і прадпрыёмстваў, а таксама ад прыватных прадпрыёмстваў і асоб па дачы ў вызначаныя Цэнтральнай Статыстычнай Управай БССР тэрміны зьвестак і матар'ялаў для выкананьня статыстычных работ у межах, вызначаных агульнарэспубліканскім плянам і спэцыяльнымі заданьнямі;

б) сачыць за выкананьнем усімі ўстановамі, прадпрыёмствамі і службовымі асобамі, якія знаходзяцца на тэрыторыі БССР пастаноў і загадаў Ураду Саюзу ССР і Ураду БССР па пытаньнях статыстыкі, а таксама пастаноў, інструкцый і абежнікаў Цэнтральнае Статыстычнае Управы БССР;

в) удзельнічаць у работах агульнасаюзных статыстычных зьездаў і канфэрэнцый, а таксама ў работах Міжнароднага Статыстычнага Інстытуту, статыстычных кангрэсаў і інш. падтрымоўваць сталую сувязь з статыстычнымі ўстановамі саюзных рэспублік і замежных дзяржаў праз абмен сваімі выданьнямі паводле існуючых законаў;

г) склікаць паводле ўстаноўленых законаў усебеларускія статыстычныя зьезды і нарады;

д) выдаваць у адпаведнасьці з дзеючымі законамі, пастановы, інструкцыі і абежнікі, якія ўваходзяць у яго кампэтэнцыю.

7. Усе дзяржаўныя ўстановы і прадпрыемствы, кааперацыйныя і грамадзкія арганізацыі, а таксама прыватныя прадпрыемствы і асобы, павінны дармова даваць у Цэнтральную Статыстычную Управу БССР у двох экземплярах друкаваныя імі статыстычныя выданьні.

III. СТРУКТУРА ЦЭНТРАЛЬНАЕ СТАТЫСТЫЧНАЕ ЎПРАВЫ.

8. На чале Цэнтральнае Статыстычнае Управы БССР стаіць Кіраўнік. Пры Кіраўніку знаходзіцца намесьнік і калегія.

9. Правы і абавязкі Кіраўніка Цэнтральнае Статыстычнае Управы БССР, яго намесьніка і членаў калегіі вызначаюцца агульным палажэньнем аб народных камісарыятах БССР.

10. У склад Цэнтральнае Статыстычнае Управы БССР уваходзяць:

а) Статыстычная Плянавая Камісія,

б) Сакратарыят,

в) Сэктар Сацыяльнае Статыстыкі,

г) Сэктар Статыстыкі сельскае гаспадаркі,

д) Сэктар Прамысловай Статыстыкі,

е) Сэктар Статыстыкі Працы,

ж) Сэктар Статыстыкі Абмену.

Апроч таго, пры Цэнтральнай Статыстычнай Управе БССР знаходзіцца Экспэртны Савет для ацэнкі хлебафуражнай прадукцыі і вызначэньня хлебафуражнага балянсу.

Увага 1. Статыстычна-Плянавая Камісія і Экспэртны Савет для ацэнкі хлебафуражнай прадукцыі і вызначэньня хлебафуражнага балянсу складаюцца з асоб пад Старшынствам Кіраўніка ЦСУ або яго намесьніка, якія асабова запьзьвяраюцца Саветам Народных Камісараў па прапанове Кіраўніка Цэнтральнае Статыстычнае Управы.

Увага 2. На час пацрыхтоўкі, вядзеньня і распрацоўкі ўсесаюзных альбо рэспубліканскіх перапісаў у складзе Цэнтральнае Статыстычнае Управы БССР могуць утварацца асобныя перапісныя аддзелы для правядзеньня ўсёй апэрацыйнай работы, вызначанай в перапісам у парадку, прадугледжаным асобнымі законамі аб перапісах.

11. На Статыстычную Плянавую Камісію Цэнтральнае Статыстычнае Управы БССР ускладаецца:

а) складаньне агульнарэспубліканскага пляну статыстычных работ, у які ўваходзяць, як работы прадугледжаныя ў БССР агульнасаюзным плянам работ, так і работы рэспубліканскага, акруговага маштабу, прадугледжаныя ЦСУ і іншымі цэнтральнымі ўстановамі, ведамствамі і арганізацыямі БССР;

б) дача заключэньняў на плянавых і запланавых статыстычных работах народных камісарыятаў БССР і іншых цэнтральных установ і арганізацый агульнарэспубліканскага значэньня БССР і ўзгадненьня гэтых работ з агульнарэспубліканскім плянам статыстычных работ.

Увага. Пры абмеркаваньні Статыстычнай Плянавай Камісіяй пытаньняў датычачых статыстычных работ, што выконваюцца народнымі камісарыятамі БССР і іншымі цэнтральнымі ўстановамі і арганізацыямі агульнарэспубліканскага значэньня, у склад камісіі запрашаецца прадстаўнік адпаведнага народнага камісарыяту, установы і арганізацыі, з правам пастаноўчага голасу.

в) разгляд і зацьверджаньне праграм і плянаў работ, падпарадкаваных Цэнтральнай Статыстычнай Управе БССР, мясцовых статыстычных органаў;

г) зборныя статыстычныя работы па балянсу, дынаміцы і кан'юнктуры народнае гаспадаркі БССР.

12. На Сэкратарыят Цэнтральнае Статыстычнае Управы БССР ускладаецца:

а) нагляд за выкананьнем мерапрыёмстваў ураду СССР і БССР і загадаў ЦСУ БССР па пытаньнях статыстыкі і ўжыцьцё ва ўстаноўленым парадку адпаведных заходаў да выкананьня іх;

б) ажыцьцяўленьне мерапрыёмстваў для пашырэньня статыстычных ведаў і падрыхтоўкі кадру статыстычных працаўнікоў;

в) арганізацыя статыстычных канфэрэнцый і зьездаў, што склікаюцца Цэнтральнай Статыстычнай Управай БССР;

г) ажыцьцяўленьне мерапрыёмстваў па рацыяналізацыі і тэхніцы статыстычных работ ЦСУ БССР і яго мясцовых органаў;

д) адміністрацыйна-арганізацыйная, фінансавая і гаспадарчая работа па ЦСУ.

13. На сэктар Сацыяльнай Статыстыкі, Цэнтральнае Статыстычнае Управы БССР ускладаецца:

а) устанаўленьне колькасьці насельніцтва БССР і складу насельніцтва паводле дэмаграфічных, нацыянальных, сацыяльных і прафэсыянальных адзнак;

б) статыстыка натуральнага і мэханічнага руху насельніцтва,

в) падлік вынікаў адміністрацыйна-тэрытарыяльнага складу БССР;

г) статыстыка народнай асьветы;

д) маральная статыстыка;

е) статыстыка народнага здароўя і санітарна-медыцынскае справы;

ж) статыстыка сацыяльнага - забясьпечаньня;

з) статыстыка камунальнае гаспадарки і жыллёвага будаўніцтва.

14. На Сэктар Статыстыкі Сельскае Гаспадаркі Цэнтральнае Статыстычнае Управы БССР ускладаецца:

а) нагляд за кан'юнктурай сельскае гаспадаркі, у паасобку, за гадавым цыклам сельска-гаспадарчай вытворчасьці і станам пасеваў і траў;

б) вывучэньне асноўных элемэнтаў сельска-гаспадарчай вытворчасьці;

в) вылічэньне хлеба-фуражнага балянсу асобных прадуктаў сельскае гаспадаркі і балянсу сельскае гаспадаркі цалкам;

г) вывучэньне працэсаў дыфэрэнцыяцыі і агрэгаваньня ў сельскай гаспадарцы;

д) вывучэньне арганізацыі працы і працэсаў індустрыялізацыі і рацыяналізацыі ў сельскай гаспадарцы;

е) вывучэньне працэсаў накапленьня, разьмеру і складу капіталаў у сельскай гаспадарцы;

ж) вывучэньне бюджэтаў селянскіх гаспадарак, гаспадарчага і асабовага спажываньня сельскае гаспадаркі;

з) вывучэньне працэсаў перасяленьня, расьселеньня і статыстыкі землеўпарадкаваньня;

і) статыстыкі ляснае гаспадаркі і спажываньня драўніны на тэрыторыі БССР;

к) статыстыка мэліярацыі і здабываньня торфу.

15. На Сэктар Статыстыкі Прамысловасьці Цэнтральнае Статыстычнае Управы БССР ускладаецца:

а) нагляд кан'юнктуры прамысловасьці;

б) вывучэньне асноўных элемэнтаў прамысловай вытворчасьці;

в) вылічэньне натуральнага аб'ёму і кошту прамысловай вытворчасьці, а таксама балянсу ўсяе прамысловае вытворчасьці цалкам;

г) вывучэньне працэсаў канцэнтрацыі прамысловасьці, рацыяналізацыі і рэканструкцыі прамысловае вытворчасьці, а таксама вызначэньне суадносін буйнай і дробнай прамысловасьці;

д) вывучэньне працэсаў накапленьня, разьмеру і складу капіталаў у прамысловасьці;

е) статыстыка прамысловага будаўніцтва ўсіх відаў;

ж) вывучэньне руху вытворчасьці працы і кошту рабочай сілы.

16. На Сэктар Статыстыкі Працы Цэнтральнае Статыстычнае Управы БССР ускладаецца:

а) статыстыка колькасьці і складу наймовых рабочых;

б) вывучэньне матар'яльных умоў існаваньня пралетарыяту, у паасобку, заработнае платы, бюджэтнага індэксу, бюджэтаў рабочых і служачых;

в) статыстыка рабочага часу і вытворчасьці працы;

г) статыстыка рынку працы і беспрацоўя;

д) вылічэньне балянсу працы;

е) стыстыка аховы працы;

ж) статыстыка канфліктаў у галіне працы;

з) статыстыка калектыўных дагавораў;

і) статыстыка прафэсыянальнага руху;

к) статыстыка сацыяльнага страхаваньня;

л) вывучэньне сацыяльных умоў наймовае працы ў сельскай гаспадарцы.

17. На Сэктар Статыстыкі Абмену Цэнтральнае Статыстычнае Управы БССР ускладаецца:

а) нагляд кан'юнктуры абмену;

б) статыстыка руху гандлёвых цэн і вылічэньня індэксаў цэн;

б) статыстыка гандлёвай сеткі;

г) статыстыка ўнутраных і замежных гандлёвых зваротаў БССР;

д) вылічэньне гандлёвай масы і вызначэньне ёмістасьці рынку;

е) вывучэньне працэсаў накапленьня, разьмеру і складу капіталаў у гандлі;

ж) статыстыка чыгуначнага, гужавога і воднага транспарту і вылічэньня транспартных балянсаў;

з) статыстыка народнай сувязі;

і) вывучэньне пытаньняў падатковага абкладаньня;

к) вывучэньне дзяржаўнага і мясцовага бюджэтаў БССР;

л) статыстыка грашовага звароту і кредытных апэрацый;

м) статыстыка каапэрацыі.

18. На Экспэртны Савет для ацэнкі хлебафуражнай прадукцыі і вызначэньня хлебафуражнага балянсу ўскладаецца:

а) устанаўленьне сыстэмы, парадку і мэтаду ацэнкі хлебафуражнае вытворчасьці і вызначэньне хлебафуражнага балянсу БССР;

б) устанаўленьне і апублікаваньне аднак хлебафуражнай вытворчасьці і вылічэньне хлебафуражнага балянсу БССР;

в) падача ў СНК перыядычных дакладаў аб сваёй працы.

IV. ПРА МЯСЦОВЫЯ СТАТЫСТЫЧНЫЯ УСТАНОВЫ.

19. Вядзеньне дзяржаўнай статыстыкі ў акругах і раёнах адпаведна ўскладаецца на акруговыя статыстычныя бюро і раённыя статыстыкаў.

А. Акруговыя статыстычныя бюро.

20. Акруговыя статыстычныя бюро, зьяўляючыся мясцовымі органамі Цэнтральнае Статыстычнае Управы для правядзеньня на тэрыторыі акругі агульнадзяржаўных статыстычных работ, нясуць разам з тым абавязкі па арганізацыі статыстычных зьбіраньняў і іншых работ мясцовага значэньня, паводле заданьняў і на сродкі акруговых выканаўчых камітэтаў.

21. Да абавязкаў акруговых статыстычных бюро належыць:

а) правядзеньне ў акрузе па заданьнях ЦСУ БССР статыстычных абсьледаваньняў і перапісаў і распрацоўка сабраных матар'ялаў;

б) правядзеньне статыстычных работ мясцовага значэньня, паводле арт. 20 гэтае пастановы;

в) агульнае кіраваньне і нагляд за пастаноўкай і правільным выкананьнем статыстычных работ мясцовымі ўстановамі ў адпаведнасьці з палажэньнямі і праграмі ўстаноўленымі ЦСУ разам з адпаведнымі народнымі камісарыятамі і ведамствамі;

г) арганізацыя ў межах акругі сеткі раённых статыстыкаў і дабровольных карэспандэнтаў і кіраваньне іх працай пры правядзеньні ўскладзеных на іх статыстычных заданьняў;

д) выданьне акруговых статыстычных абглядаў і бюлетэняў;

е) скліканьне са згоды ЦСУ і акруговага выканаўчага камітэту акруговых статыстычных нарад.

Увага. Агульныя перапісы мясцовага значэньня ня могуць рабіцца на працягу году да адпаведных агульнадзяржаўных перапісаў. У іншы час ня інакш, як пасьля атрыманьня дазволу Савету Народных Камісараў, якое запрашваецца праз ЦСУ БССР.

22. Штогадовы плян мясцовых статыстычных работ пасьля ўгадненьня в Цэнтральнай Статыстычнай Управай БССР зацьверджваецца акруговым выканаўчым камітэтам.

23. На чале акруговага статыстычнага бюро стаіць загадчык, які назначаецца акруговым выканаўчым камітэтам пасьля ўгадненьня в ЦСУ. Загадчык акруговага статыстычнага бюро можа звальняцца толькі паводле ўгодзенага выраженьня ЦСУ з акруговым выканаўчым камітэтам.

24. Загадчык акруговага статыстычнага бюро адказвае за агульны ход справы акруговага статыстычнага бюро і за правільную пастаноўку статыстычных работ у акрузе як перад Цэнтральнай Статыстычнай Управай, так і перад акруговым выканаўчым камітэтам.

25. У складзе акруговых статыстычных бюро арганізуюцца на асобных галінах статыстыкі сэкцыі: сацыяльнай статыстыкі, статыстыкі прамысловасьці і працы, статыстыкі абмену і сельска-гаспадарчай статыстыкі.

Увага. Сэкцыя статыстыкі прамысловасьці і працы і сэкцыя статыстыкі абмену могуць быць вылучаны пасьля ўзгадненьня ЦСУ з НК РСІ у адну сэкцыю.

Б. Раённыя статыстыкі.

26. Пры раённых выканаўчых камітэтах для выкананьня на мясцох работ па дзяржаўнай статыстыцы знаходзяцца раённыя статыстыкі.

Увага. Пры гарадзкіх саветах неакруговых гарадоў з насельніцтвам больш 15000 чалавек, знаходзяцца гарадзкія статыстыкі, якія прыраўніваюцца на правах і абавязках да раённых статыстыкаў.

27. Раённыя статыстыкі працуюць пад кіраўніцтвам акруговага статыстычнага бюро і разам з тым адказваюць перад раённым выканаўчым камітэтам за агульны ход работ, якія праводзяцца імі.

28. У кампэтэнцыю раённых статыстыкаў уваходзіць:

а) арганізацыя і правядзеньне ў межах раёну розных статыстычных абсьледаваньняў і бягучых нагляду на паказаньнях акруговых статыстычных бюро;

б) выкананьне даручэньняў акруговага статыстычнага бюро па выняньню з дзеловодства раённых выканаўчых камітэтаў і іншых мясцовых установ патрэбных статыстычных зьвестак;

в) агульнае кіраваньне падлікам-статыстычнымі апэрацыямі ўстаноў раённых выканаўчых камітэтаў і нагляд за правільнасьцю іх выкананьня ў адпаведнасьці з паказаньнямі ЦСУ;

г) арганізацыя ў раёне сеткі дабровольных карэспандэнтаў, сталая в імі сувязь і інструктаваньне іх па выкананьню заданьняў акруговых статыстычных бюро.

29. Для абслугоўваньня раённага выканаўчага камітэту раённы статыстык павінен весьці паводле інструкцый, распрацоўваемых ЦСУ, сьпісы знаходзячыхся ў раёне насельных пунктаў, прамысловых прадпрыёмстваў, культурна-асьветных установ і іншых аб'ектаў з паказаньнямі па іх галоўных статыстычных даных. Разам з тым і акруговыя статыстычныя бюро робяць захады да забясьпечаньня раённага статыстыка асноўнымі статыстычнымі зборкамі па раёну.

30. Раённыя выканаўчыя камітэты могуць ускладаць спэцыяльныя статыстычныя даручэньні на раённых статыстыкаў, ня інакш, як на згодзе з акруговым статыстычным бюро і паводле зацьверджаных апошнім праграмаў; пры гэтым выкананьне мясцовых заданьняў дазваляецца ня інакш, як пры ўмове забясьпечанасьці выкананьня ўскладзеных на іх статыстычных работ.

31. Раённыя статыстыкі назначаюцца раённымі выканаўчымі камітэтамі з ліку кандыдатаў, што адпавядаюць патрабаваньням, вызначаным ЦСУ для раённых статыстыкаў. Акруговым статыстычным бюро даецца права, калі не адпавядае прапанаванны раённым выканаўчым камітэтам кандыдат, патрабаваць яго замены і прапанаваць свайго кандыдата, перанёсшы пытаньне аб назначэньні, калі ня будзе згоды з раённым выканаўчым камітэтам, на разгляд прэзыдыуму акруговага выканаўчага камітэту.

32. Раённыя статыстыкі па сваёй кампэтэнцыі бесспасрэдна зносяцца з акруговым статыстычным бюро, а таксама з мясцовымі ўстановамі, прадпрыёмствамі і прыватнымі асобамі.

33. Раённыя статыстыкі абслугоўваюцца ў адміністрацыйным парадку і гаспадарчых адносінах сродкамі раённага выканаўчага камітэту.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Час. Вык. Аб. Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Стаішэўскі.**

7 ліпеня, 1928 г.
г. Менск.

Што перашкаджала нармальнаму будаўніцтву Унівэрсытэцкага гарадка.

(Гутарка з галоўным архітэктарам будаўніцтва Унівэрсытэцкага гарадка т. Лаўровым).

Згодна дагавору Наркамасьветы з аўтарам праэкту Унівэрсытэцкага гарадка архітэктарам Запарожцам, праэкт гэты павінен быць прыняты спэцыяльнай камісіяй, якую арганізаваў НКА.

Пры разглядзе праэкту прыёмачная камісія прызнала, што ён у сэнсе пляніроўкі, адпаведнасьці функцыянальным запатрабаваньням Унівэрсытэту і архітэктурна-мастацкага афармленьня зроблены здавальняюча. У адносінах-жа распрацоўкі рабочых чарцяжоў камісія знайшла шэраг нядахопаў і прапускаў, якія патрабавалі выпраўленьня і дадатку для прыдзеньня іх у мантажны від.

Жалеза-бэтонныя канструкцыі, асабліва ў адносінах вялікіх кэсонных перакрыцьцяў такіх надзвычайна вялікіх пралётаў, як у Унівэрсытэцкім гарадку, у савецкай і наогул расейскай практыцы яшчэ не сустракалі. Зразумела, гэта вымагала выключна ўважлівага і асьцярожнага да іх падыходу, каб быць упэўненым у належнай моцнасьці.

Па запатрабаваньні камісіі, паказаныя кэсонныя перакрыцьці павінны былі быць праверены і завізіраваны буйнейшымі спэцыялістамі па жалезабэтону, а гэтымі спэцыялістымі зьяўляюцца прафэсары Лолейх і Келдыш. Прафэсар Лолейх спачатку ўзяўся за гэту справу, але, дзякуючы ад'езду заграніцу, ня мог кансультаваць праэкту перакрыцьця.

Пасьля гэтага кансультацыя была перададзена прафэсару Келдышу, які вядзе разьлікі на сваіх уласных мэтадах, якія розьняцца ад існуючай сучаснай літаратуры па жалеза-бэтону.

Усе гэтыя прыведзеныя вышэй абставіны выклікалі некаторую затрымоўку ў разгортваньні работ па будаўніцтву Унівэрсытэцкага гарадка.

Камісія прызнала, што работу можна было разгортваць толькі пры наяўнасьці высокакваліфікаванага тэхнічнага нагляду. Між тым арганізаваць апошні было вельмі цяжка, бо запрошаныя з Масквы інжынэры адмаўляліся ехаць у Менск і толькі 26 чэрвеня тэхнічны нагляд НКА быў поўнасьцю арганізаваны.

У сучасны момант жалеза-бэтонныя чарцяжы в візай прафэсара Келдыша паступаюць на будаўніцтва і няма ніякіх падстаў меркаваць, што работы могуць быць затрыманы.

Зараз будуецца 4 карпусы, з якіх у мэдычным ідзе ўжо кладка сьцен да 3-га паверху і ў анатамічным—да 2-га паверху. Для прыродазнаўчага корпусу заканчваецца кладка фундаменту, а для галоўнага аудыторнага корпусу ўжо падыходзяць к канцу вялікія зямляныя работы. Будаўніцтва пятага корпусу—хэмічнага, распачнецца пасьля 20 ліпеня.

У адносінах матар'ялаў няма вялікай небясьпекі за своечасовае забясьпечаньне імі будаўніцтва. Белдзяржстрой прымае ўсе меры да закупкі і падвозкі неабходных будаўнічых матар'ялаў, а асабліва цэглы, якая дастаўляецца з цагляных заводаў Белдзяржстрою.

Зараз паміж тэхнічным наглядам НКА і вытворчым апаратам Белдзяржстрою ўстанавіўся дзелавы кантакт, які дапаможа забясьпечыць далейшае пасьпешнае разгортваньне будаўнічых работ.

На ўчарашні дзень на будаўніцтве было занята каля 400 рабочых, а пасьля пачатку бэтаніраваньня фундаменту на галоўнаму аудыторнаму корпусу колькасьць рабочых узрасьце да 500 ч.

У бягучым будаўнічым сэзоне ўнаўне мягчыма пабудаваць учарне 4 корпусы і ў залежнасьці ад матар'яльных магчымасьцяй можа быць пабудаваны і 5-ы корпус.

ХРОНІКА.

У Прэзыдыуме менскага гарсавету.

Камандыроўка па трамвайных справах.

У сувязі з тым, што «Трамстрой» за будаўнічыя работы на трамваю паставіў вялікія цэны, Прэзыдыум гарсавету паставіў у тэрміновым парадку камандыраваць у Маскву старшыню гарсавету т. Яцкевіча для ўпарадкаваньня пытаньняў, маючых сувязь з пабудовай у Менску трамваю.

Перадача дому біржы працы.

Прэзыдыум гарсавету даручыў менскаму аддзелу камунальнай гаспадаркі перадаць біржы працы дом № 41-23 на рагу Нова-Мясьніцкай і Замкавай вуліц. Гэты дом будзе скарыстаны для разьмяшчэньня сэкцыі жанчын-чорнарабочых.

Прывітаньне харкаўскаму гарсавету.

Менскі гарсавет атрымаў запрашальную тэлеграму ад харкаўскага гарсавету на ўрачыстае пасяджэньне пленуму апошняга, які прысьвечаны 5-хгодзьдзю Канстытуцыі СССР. У сувязі з немагчымасьцю паслаць свайго прадстаўніка, прэзыдыум пастанавіў паслаць харкаўскаму гарсавету прывітальную тэлеграму.

Шэфства над артпалком.

Прэзыдыум гарсавету даручыў спэцыяльна вылучанай камісіі распрацаваць пытань не аб парадку прыняцьця шэфства над №-ім беларускім артпалком.

Калегія НКА зацьвердзіла плян увядзеньня ўсеагульнага навучаньня.

На апошнім пасяджэньні калегія Наркамасьветы абгаварвала плян увядзеньня ўсеагульнага навучаньня.

Калегія пастанавіла плян адчыненьня школьных камплектаў зацьвердзіць і ўнесьці яго на абгавараньне Савнаркому праз Дзяржплан. У сувязі з тым, што на працягу нацёхгодзьдзя высьветлянца недахоп у настаўніцкіх сілах, калегія НКА даручыла спэцыяльнай камісіі ашчэ раз праверыць рэальнасьць пляну падрыхтоўкі настаўніцтва.

Калегія лічыць неабходным прадугледзіць у наступным бюджэтным годзе водпуск сродкаў на друкаваньне матар'ялаў па ўсеагульным навучаньні.

Мазырскай акруговай інспэкцыі Наркасьветы за непрадстаўленьне да гэтага часу тэрытарыяльных плянаў настаўлена на від і даручана прыцягнуць да адказнасьці тых райінспэктароў, якія не прадставілі гэтых плянаў на сваіх раёнах.

У Аўтадоры БССР

Рост ячэек Аўтодору па Менскай акрузе.

Згодна апошніх вестак, па Менскай акрузе налічваецца 57 ячэек Аўтодору з агульным лікам сяброў у іх звыш 2000.

З гэтай колькасьці ячэек у горадзе налічваецца—42, у раёнах—11 і ў вёсках—4 ячэйкі.

Усебеларуская нарада па дарожнаму будаўніцтву.

У жніўні месяцы праўленьнем Аўтадору БССР склікаецца ўсебеларуская нарада па дарожнаму будаўніцтву.

На гэтай нарадзе будуць абгавораны пэлы шэраг пытаньняў арганізацыйна-тэхнічнага парадку, а таксама аб удзеле Аўтадору ў дарожным будаўніцтве.

Аўтадор на Мазыршчыне.

На 1-га ліпеня па Мазырскай акрузе налічваецца 15 ячэек Аўтадору, якія аб'ядняюць 244 сяброў.

З гэтай колькасьці па гораду налічваецца 8 ячэек Аўтодору, па раённых цэнтрах—6 і адна вясковая ячэйка.

Акруговым аддзяленьнем Аўтадору праведзена вялікая праца па абсадцы дрэвамі дарог.

Саматужнае ткацтва.

МАГАЗЫН САМАТУЖНЫХ ВЫРАБАЎ У МЕНСКУ.

У Менску нядаўна адчыніўся магазын па продажу розных саматужных тавараў: абрусоў, ручнікоў, дываноў, розных тканіны, пасуды і інш.

Попыт на гэтыя тавары з боку насельніцтва вялікі.

13 САМАТУЖНЫХ АРЦЕЛЯЎ.

Зараз у БССР ужо арганізаваны 13 саматужных ткацкіх арцеляў. У арцелі ўцягваецца галоўным чынам бядняцкая частка вёскі.

У Менску і ў Барысаве існуюць майстэрні па вырабу ставкоў, а патрэбныя шырокія сёрды будуць выпісваць з Масквы.

НАРАДА ПА САМАТУЖНАМУ ТКАЦТВУ.

У хуткім часе пры беларускай прамысловай кааперацыі адбудзецца нарада аб вызначэньні мастацкіх шляхоў саматужнага ткацтва. У працах нарады будуць прымаць удзел прадстаўнікі БДМ, ІБК, паасобныя мастакі і інш.

Конкурс на лепшы ўраджай па БССР.

Гэтымі днямі ў Нар. Кам. Земляробства адбылася арганізацыйная нарада прадстаўнікоў Наркамзему, Белсельтрасту і Белсельсаюзу па пытаньні аб конкурсе на лепшы ўраджай па БССР.

Пастаноўлена конкурс на лепшы ўраджай па БССР праводзіць на старонках газ. „Беларуская Вёска" і часопісі «Плуг».

Менскі дзень.

Камунальная сэкцыя намгасу заняцца дэтальным вывучэньнем пытаньня пабудовы электрычнай падстанцыі, якая патрэбна будзе для будучага трамваю.

55 мілёнаў рублёў дасягнуў агульны зварот Белкаапсаюзу за першае паўгодзьдзе бягучага гаспадарчага году.

Зуба-тэхнічная лябараторыя пры менскай цэнтральнай рабочай амбуляторыі ў сувязі з рамонтам вачыкова да 1-га жніўня.

Гандльстрой ужо распачаў кладку сьцен корпусу клінікі па нервовых хваробах. Будаўніцтва будзе скончана ў наступным годзе.

У БДТ-2.

БДТ-2, які пераехаў у Гомель, зараз рыхтуе да пастаноўкі п'есу Ільліанага «На прадвесьні», якая малюе беларускую вёсну з нядаўнага мінуулага.

Тэатральны сэзон БДТ-2 адчыніць пастаноўкай «Разлому». У наступны сэзон будуць ставіцца п'есы „Калі сьпяваюць пеўні", «Цар Мансімільян», „У мінулы час", „Каля Тэрасы", «Астап» і інш.

НК РСІ аб працы дасьледчага Ін-ту Лясн. і С.-гасп. імя Леніна.

НК РСІ зрабіў папярэднае выбарачнае абсьледаваньне навукова-дасьледчага Інстытуту Лясной і Сельскай гаспадаркі імя тав. Леніна. Абсьледаваньне паказала, што разам з разгорнутай працай, ёсьць шмат недахопаў: перагрузка некаторых супрацоўнікаў, адсутнічаньне кантролю за працай, непарадкі ў канцэляры, кепская пастаноўка вучоту асабістага складу і г. д.

Калегія НК РСІ прыняла пастанову аб палепшаньні працы Інстытуту і зьвяшла неабходным зрабіць дэтальнае абсьледаваньне з прыцягненьнем навуковых сіл.

Да пабудовы заводу па скарыстаньню касьцей.

Прэзыдыум ВСНГ БССР пастанавіў у наступным годзе распачаць пабудову ў г. Ворны заводу па ўтылізацыі касьцей. Водлуг вытворчага пляну, завод будзе пераапрацоўваць у год 600.000 пуд. касьцей у касьцяную муку, клей і касьцяное сала. Будаўніцтва заводу разьлічана на два гады і абыйдзецца прыблізна ў 1.150.000 р. Гэты завод электраэнэргію будзе браць з Асінстрою. У якасьці аналу для тэхналёгічнае мэт будзе скарыстоўвацца торф. Залежы торфу каля Ворны дасягаюць да 1.000.000 тон.

Да новай хлебазагатоўчай кампаніі.

Сёлета загатоўку па БССР, на пастанове Саюзнага Нар. Кам. Гандлю, будуць весьці беларуская кантора «Саюзхлеб» і Белкаапсаюз.

Белсельсаюз, на пастанове Нар. Кам. Гандлю БССР, будзе загатоўляць хлеб на дагавору з „Саюзхлебам" на камісійных пачатках.

Прызначэньне пэрсанальнай пэнсіі.

Міжведамсьцьвенная камісія пры Нар Кам. Сацыяльнай Забясьпекі БССР прызначыла пэрсанальную пэнсію ў разьмеры 60 руб. былым начальніку раймілыцы Бердзынскага раёну тав. Голубу.

Тав. Голуб праяяў гэраізм у барацьбе з бандытызмам і злачынасьцю.

Дасягненьні сялян-дасьледчыкаў у іх працы.

Бюро сялян-дасьледчыкаў, арганізаванае пры Навукова-Дасьледчым Інстытуце імя Леніна, мае вялікія дасягненьні ў сваёй працы.

За апошні год менскай дасьледчай станцыяй было праведзена 115 дасьледаў.

Дасьледы праводзяцца ў сялянскіх гаспадарках, 12 калгасах, 14 савгасах і 3 агрэгатах.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

Нявытрыманы лясьнік.

Уладзімер Шышла, будучы лясьніком Неманіцкага лясьніцтва, 22 кастрычніка 1927 году затрымаў у лесе з крадзенымі дрывамі грамад. Лабача і калі апошні, не жадаючы везьці дровы ў сельсавет, пачаў уцякаць—Шышла стрэліў у Лабача і ёкка яго раніў.

Суд прытварыў Уладзімера Шышлу на тры гады вызволеньня